

ПРЫНЦ! ЁН ЖА БУДАЎНІК. І НЕ ТОЛЬКІ **11**

«ХТО КАГО?» ПЕРАМАГАЕ ДРУЖБА! **13**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СТУДЗЕНЯ 2023 г. СЕРАДА № 1 (29881)

# «Усё ў нашым жыцці будзе залежаць ад кожнага з нас. І ад усіх нас разам»

## Навагодні зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа

Дарагія суайчыннікі!

Госці Беларусі!

Вось і настала навагодняя ноч, самая доўгачаканая і самая скарацечная ў годзе.

Дома, сярод сяброў, на рабочым месцы або ў дарозе — усе мы цяпер глядзім на гадзіннік і бачым, як імклівa ляцяць і адыходзяць у гісторыю хвіліны, набліжаючы нас да новага 2023 года.

І праз імгненне ўжо адыходзячы год — Год гістарычнай памяці — таксама стане часткай мінулага, а яго падзеі запоўняць чарговую главу летапісу жыцця беларускага народа.

Многія задаюць сабе пытанне: якім адыходзячы год застанецца ў нашай памяці?

Няпростым, супярэчлівым, часам напружаным. Але галоўнае — для нас ён быў мірным.

Мы, магчыма, нават у большай ступені, чым раней, адчулі пагрозу спакойнаму і бяспечнаму жыццю, да якога прывыклі.

Мацней сталі непакоіцца за свaіх дзяцей, родных, блізкіх і нават задумаліся пра будучыню чалавецтва. Вастрэй усвядомілі каштоўнасць міру на роднай зямлі, які стаў для нас галоўным дасягненнем года.

Адыходзячы 2022-і стаў годам палітычнага выбару.

Беларусы адказалі адзінствам у абарону сваёй гістарычнай памяці, сваіх прынцыпаў і традыцый. Кожны, хто душой хварэе за лёс роднай краіны, узяў удзел у абмеркаванні новай Канстытуцыі, вызначыўшы будучыню Беларусі.

І, вядома, 2022-і ўвайшоў у гісторыю як год плённай працы.

Мы сабралі рэкордны ўраджай хлябоў — больш за тону на жыхара краіны. Забяспечылі сябе спраўна прадуктамі і накармілі мільёны жыхароў планеты, выручыўшы за экспарт прадуктаў харчавання больш за 20 мільярдаў рублёў.

Пабудавалі новыя паліклінікі, бальніцы, школы, дзіцячыя садкі, масты і дарогі — больш за 50 маштабных аб'ектаў.



Фота БелТА.

Умацавалі энергетычную бяспеку. Беларусам не давядзецца аддаваць апошні рубель за святло і цяпло, якія становяцца раскошай для нашых суседзяў.

Мы захавалі рабочыя месцы і сацыяльную накіраванасць эканомікі — дапамогу атрымалі ўсе, хто мае патрэбу.

Амаль 50 тысяч беларускіх сем'яў сустракаюць Новы год у новых кватэрах.

Вядома, не ўсё, што задумалі, паспелі зрабіць, але працавалі шмат і плённа.

Дзякуй усім вам за гэты год!

Усім, хто выхоўвае нашых дзяцей, вучыць школьнікаў і студэнтаў, лечыць нас і дапамагае адзінокім людзям.

Дзякуй рабочым і сялянам, брыгадзірам і майстрам, кіраўнікам прадпрыемстваў — усім, хто робіць жыццё больш камфортным, развівае сферу паслуг, уносіць у яго яркія фарбы, рэалізоўваючы творчыя праекты, і забяспечвае бяспеку, цвёрда абараняючы граніцы і парадак у нашым агульным доме — Беларусі.

Ганаруся вамі — сапраўднымі гаспадарамі святой беларускай зямлі!

Дарагія беларусы!

Пагадзіцеся, нягледзячы на выпрабаванні адыходзячага года, з намі адбылося шмат добрага.

Мы стварaлі новыя тавары і выходзілі на новыя рынкі ў той час, калі нас душылі санкцыямі.

Нам закрывалі граніцы, а мы нанава адкрылі для сябе нашу Беларусь. Многія паглядзелі на сваю краіну па-новаму, усвядомілі тыя багацці, якімі валодаем: прыгажосць прыроды, таямніцу гістарычнага мінулага, скарбы нацыянальнай культуры і традыцый. Больш даведаліся аб роднай зямлі і больш пранікліся гонарам за родны край.

Мы адказалі даверам і дружбай усім, хто адгароджваецца ад нас платамі. Сотні тысяч грамадзян Еўрасаюза прыехалі ў Беларусь без віз і перашкод.

Мы далі прытулак бежанцам з гарачых месцаў, далі дах над галавой і працу. Прынялі ў сваю сям'ю новых грамадзян.

Звыш 7 тысяч іншаземцаў з 31 краіны ўжо сёння працуе на карысць і працвітанне сваёй новай радзімы. Большасць з іх — украінцы.

Беларусь была і застанецца гасціннай і дружалюбнай краінай. Краінай, адкрытай для ўсіх, хто сэрцам прыме нашы каштоўнасці і традыцыі, шчыра палюбіць яе і захоча назваць сябе беларусам.

Дарагія суайчыннікі!

Сёлета мы ўбачылі, які цесны наш неабсяжны свет. Дастаткова распаліць канфлікт у адной краіне, як пачынае ліхаманіць усю планету.

Ведаю, больш за ўсё вы хочаце пачуць, што будзе далей. Ці застанецца Беларусь астраўком бяспекі? Упэўнены, што гэта пытанне стане і галоўным жаданнем, якое вы загадаеце апоўначы.

Адказ просты: усё ў нашым жыцці будзе залежаць ад кожнага з нас. І ад усіх нас разам.

Калі мы хочам жыць у міры і бяспецы, то перш за ўсё павінны паважаць і шанаваць працу людзей у пагонах, выхоўваць дзяцей патрыётамі сваёй краіны і выконваць закон.

Калі мы хочам жыць у міры і дастатку, то павінны шмат і добрасумленна працаваць.

Калі мы хочам жыць у свабоднай і незалежнай дзяржаве, то павінны берагчы і абараняць гістарычную памяць, духоўныя каштоўнасці і спрадвечныя традыцыі.

Наступны год мы аб'яўляем Годам міру і стварэння. Гэта адпавядае і духу часу, і памкненням нашых сэрцаў.

Я гэтак жа моцна, як і вы, жадаю міру і дабра роднай Беларусі.

Моцнага здароўя і дзіцячага смеху — кожнай сям'і.

Сяброўскага клопату і душэўнай цеплыні — кожнаму, хто адзінокі.

Сямейнага ладу і дабрабыту — у кожны дом.

Няхай нашы жаданні здзейсняцца!

Будзьце шчаслівыя, беражыце сябе і сваіх блізкіх!

З Новым годам, дарагія беларусы!

### КОРАТКА

- **Падарунак вяскоўцам на Новы год: станцыю абезжалезвання пабудавалі ў Івацэвіцкім раёне.**
- «Белавія» адкрые новыя чартары ў Катар з 4 сакавіка.
- **Больш за 380 тысяч жыхароў ЕС наведалі Беларусь па бязвізе.**
- У Беларусі пачалі выпускаць лінейку карыснага марожанага без цукру і лактозы.

ISSN 1990 — 763X

# 2023 ГОД АБ'ЯЎЛЕНЫ ГОДАМ МІРУ І СТВАРЭННЯ

У мэтах кансалідацыі беларускага народа, умацавання ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 2023 год аб'яўлены Годам міру і стварэння. Адпаведны Указ № 1 ад 1 студзеня 2023 года падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

Ключавымі кірункамі ў наступным годзе будуць удасканаленне сістэмы ваенна-патрыятычнага выхавання насельніцтва, прасоўванне мірных ініцыятыў грамадзян і грамадскасці, садзейнічанне міжканфесійнаму дыялогу, які забяспечвае мір і згоду ў беларускім грамадстве, дэманстрацыя пераваг беларускай эканамічнай мадэлі ва ўмовах глабальнай турбулентнасці, пазіцыяванне стваральнай працы як галоўнай умовы развіцця беларускай дзяржавы.

Такая тэматыка дасць магчымасць умацаваць усправанне Беларусі як астраўка міру, бясспрэчная каштоўнасць якога для насельніцтва краіны з'яўляецца важкім аргументам у дасягненні згоды па іншых найважнейшых пытаннях грамадскага жыцця. Беларускім адказам на мілітарызацыю ў еўрапейскім рэгіёне стане мірная стваральная праца суайчыннікаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# За даўгабуды спытаюць строга

## Развіццё будаўнічага комплексу абмеркавалі ў Прэзідэнта

**Першым публічным мерапрыемствам у графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў новым годзе стаў даклад міністра архітэктуры і будаўніцтва. «Шэраг праблем мне прапанавалі паслухаць, звязаных з будаўнічай галіной. Я не буду гэта рабіць. Гаварыльня нікому не патрэбная», — абазначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён акрэсліў канкрэтныя пытанні.**

Першае — спрашчэнне працэсу будаўніцтва, так, як тое зрабілі па прыватным будаўніцтве. Прэзідэнт нагадаў, што патрабаванні да ўзвядзення прыватнага жылля былі спрошчаны, і людзі станоўча на гэта адрэагавалі. «Участак ёсць у чалавека — будуй. Ты будуеш для сябе, нясеш за гэта адказнасць. І, як бачым, людзі самі пайшлі і ў МНС, і да вас, каб вы падказалі, як лепш. Так павінна быць, чалавек сам павінен вызначацца, як яму лепш будаваць дом», — адзначыў Прэзідэнт. Пытанне спрашчэння працэсу будаўніцтва актуальнае і для іншых аб'ектаў.

«Мы дамовіліся, што да гэтага года вы ўсё ўладзіце і ніхто не будзе крыўдзіцца: ні кіраўнікі прадпрыемстваў, якія будуюць новыя цэхі, ні прыватныя асобы, ні дзяржслужачыя, ні тыя, хто жыллё сабе будзе будаваць, ці тыя, хто будзе купляць кватэры ў шматпавярховіках. Яны крыўдзіцца на нас не будуць за залішнія патрабаванні», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён пацікавіўся, ці выкананы гэтыя дамоўленасці і ці адрэгуляваны адпаведныя нормы і правілы.

Другое пытанне — вынікі мінулага года. Па словах Прэзідэнта, у будаўнічай галіне яны не цешаць: «Як мяне інфармуюць, вы ўпалі да ўзроўню папярэдняга года. Прынамсі, вы сапраўды не дасягнулі планавых паказчыкаў. Вы зноў пачынаеце даўгабуды спараджаць у краіне». Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што сярод апошніх сустракаюцца і жылыя аб'екты.

«Гэта бязладдзе. Мы людзям паабяцалі, што своечасова ўвядзём жылыя дамы, а мы іх не ўводзім. Ёсць і іншыя аб'екты недабудаваныя, за гэта патрабаванне будзе сур'ёзнае», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што не хоча паўтарэння сітуацыі, калі для вырашэння праблемы даўгабудаў прыйшлося прымаць жорсткія меры.

Таксама Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся перспектывамі будаўнічай галіны ў сувязі з планамі па забеспячэнні жыллём вайскоўцаў, шматдзетных сем'яў і іншых катэгорый, якіх было вырашана забяспечыць жыллём у першую чаргу.

**Міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ** далажыў, што дзейнасць міністэрства ў 2022 годзе была накіравана на забеспячэнне ўстойлівай работы будаўнічага комплексу краіны, безумоўнага выканання задач у жыллёвым будаўніцтве, дыверсіфікацыі рынкаў збыту будаўнічай прадукцыі. Таксама вялася работа над удасканаленнем нарматыўна-прававой базы ў будаўнічай галіне. «У адносінах да жыллёвага будаўніцтва ўвод жылля ў эксплуатацыю чакаецца ў аб'ёме чатырох мільёнаў двухсот тысяч квадратных метраў, што адпавядае мэтаваму паказчыку дзяржаўнай праграмы на 2022 год. Практычна палова пабудаванага жылля — індывідуальнае: 45 працэнтаў. Жылля з дзяржпадтрымкай у 2022 годзе ўзведзена на 100 тысяч больш, чым было запланавана, — адзін мільён трыста тысяч квадратных метраў. Таксама перавыкананы планы па будаўніцтве арэнднага жылля на 60 працэнтаў і па будаўніцтве электрадамоў на 35 працэнтаў», — паведаміў Руслан Пархамовіч.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

Пасля даклада ў Прэзідэнта міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан Пархамовіч расказаў журналістам, што тэма даўгабудаў — сапраўды праблемнае пытанне, для вырашэння якога за апошнія два гады праведзена вялікая работа. На 1 студзеня 2020 года такіх аб'ектаў было 4560. За два гады іх колькасць скарацілася практычна ўдвая. «Самае галоўнае не хуткасць, а тое, каб кожны аб'ект (няхай ён не завершаны, прастаяў працяглы тэрмін) быў уцягнуты ў эканоміку і эфектыўна выкарыстоўваўся. На 2023 год мы запланавалі далучэнне 808 чарговых аб'ектаў. Да 2025 года, думаю, іх колькасць скароціцца да мінімуму», — адзначыў Руслан Пархамовіч.

Міністр архітэктуры і будаўніцтва канстатаваў, што падманутых грамадзян, якія пазбавіліся б сваіх грошай, уклаўшы іх у будаўніцтва, у краіне няма. Некаторыя аб'екты ідуць цяжка, але ўсе аб'екты жыллёвага будаўніцтва, якія і раней траплялі ў такі пералік, паспяхова ўведзены ў эксплуатацыю.

Вялікае значэнне мае і пытанне спрашчэння прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю. Па словах міністра, гэта павысіць адказнасць заказчыка, праектных і падрадных арганізацый.

# Новыя правілы для будучых студэнтаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 2, якім зацвярджаецца новая рэдакцыя Правілаў прыёму асоб для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Правілы прыёму дапрацаваны з улікам вынікаў шырокага вывучэння грамадскай думкі і экспертных ацэнак, а таксама апрабацыі асобных норм у ходзе ўступнай кампаніі 2022 года. У цэлым абноўленымі правіламі прыёму захоўваецца замацаваная Кодэксам аб адукацыі сістэма паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Больш падрабязна з абноўленымі правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы можна азнаёміцца на інтэрнэт-партале Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Правілы накіраваны на павышэнне аб'ектыўнасці ацэнкі ведаў абітурыентаў і забяспечваюць выкананне прынцыпу роўнай магчымасці паступлення ў ВНУ. Імі таксама прадугледжваецца ўдасканаленне адбору найбольш падрыхтаваных і матываваных абітурыентаў для атрымання запатрабаваных эканомікай краіны спецыяльнасцяў», — адзначылі ў прэс-службе Прэзідэнта.

У прыватнасці, без уступных іспытаў прадугледжваецца залічэнне пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд пры паступленні ў гэтыя ВНУ, выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка па рэкамендацыі наглядальнага савета, выпускнікоў ліцэяў пры універсітэтах пры паступленні ў гэтыя універсітэты, а таксама асоб, якія здалі адзіны дзяржаўны экзамен у Расіі (пры паступленні на платную форму навучання).

Па-за конкурсам будуць залічваца дзеці ваеннаслужачых, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў, выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў пры паступленні ў ВНУ Мінабароны, МУС, Дзяржпагранкамітэта і на ваенныя факультэты.

Уводзяцца асаблівыя ўмовы паступлення на спецыяльнасці для Узброеных Сіл, транспартных войскаў і органаў пагранічнай службы. На названыя спецыяльнасці абітурыенты будуць здаваць толькі два прадметы (мова і адзін профільны прадмет у форме ЦЭ або ЦТ).

Прадугледжваецца прыём на мэтавую падрыхтоўку па выніках унутранага іспыту ў ВНУ ў вуснай або практычнай форме (у залежнасці ад спецыяльнасці). Пры падачы дакументаў для паступлення абітурыент павінен прадставіць характарыстыку са школы (каледжа). Указам таксама замацоўваюцца паўнамоцтвы Мінадукацыі па рэгуляванні асобных пытанняў правядзення ўступнай кампаніі, у тым ліку па вызначэнні парадку арганізацыі і правядзення ЦЭ і ўнутраных іспытаў, тэрмінаў прыёму дакументаў і залічэнні абітурыентаў.

«Мінадукацыі ў найкарацейшыя тэрміны забяспечыць комплекс арганізацыйна-метадычных мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў указа, уключаючы ўнясенне змяненняў у адпаведныя пастановы Савета Міністраў, акты Міністэрства адукацыі і ВНУ. Па прынятых новаўвядзеннях будзе праведзена неабходная тлумачальная работа для абітурыентаў і іх бацькоў, у тым ліку ў СМІ. Прыняцце ўказа будзе садзейнічаць далейшаму ўдасканаленню нацыянальнай сістэмы адбору і падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй, зыходзячы з абазначаных Прэзідэнтам прынцыпаў справядлівага стаўлення да людзей і забеспячэння роўных умоў пры паступленні ў ВНУ», — дадалі ў прэс-службе.

# ДОБРАЯ НАВАГОДНЯЯ ТРАДЫЦЫЯ

## Прысуджаны прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва і «Беларускі спартыўны Алімп»

Кіраўнік дзяржавы 30 снежня падпісаў адпаведныя ўказы, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

### Хто ўдастоены прэміі «За духоўнае адраджэнне»

**За актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, якая садзейнічае захаванню і прымнажэнню нацыянальнага культурнага набытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і ідэй міласэрнасці, па выніках 2022 года прысуджаныя чатыры прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».**

Высокай узнагароды ўдастоены аўтарскі **калектыў у складзе Васіля Баранчука, дырэктара Духоўна-асветніцкага цэнтра прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў Бабруйску, і настаяцеля прыхода гэтага храма протаіерэя Віктара Толаха** за вялікі ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцяў, культурнае і маральнае выхаванне дзяцей і моладзі.

За актыўную дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні падлеткаў прэміяй адзначаны заслугі **ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» вайсковай часці 3214 унутраных войскаў МУС.**

Прэміі «За духоўнае адраджэнне» ўдастоены **калектыў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук** за значны ўклад у выхаванне любові да Айчыны, даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны, выпуск навуковага энцыклапедычнага выдання «Гарады і вёскі Беларусі».

Сярод лаўрэатаў прэміі таксама **Беларуская Таварыства Чырвонага Крыжа.** Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне ўдастоена гэтай узнагароды за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, значны ўклад у аказанне дабрачыннай дапамогі і развіццё валанцёрскага руху.

### За што прысуджаныя спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва

**За выдатныя дасягненні ў сферы музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музейнай справы, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысуджаныя 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.**

Спецыяльнай прэміі ўдастоены **аўтарскі калектыў у складзе Яніны Барысевіч, загадчыка аддзела традыцыйнай мастацкай культуры Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці; Наталлі Мазепы, намесніка дырэктара Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры; Георгія Егіязарана, старшыні Кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры намесніцтве армянскага культурна-асветніцкага таварыства «Аястан».** Яны адзначаны гэтай узнагародай за ўклад ва ўмацаванне нацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве, правядзенне Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

**Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя** ўдастоена спецпрэміі за ўклад у грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, рэалізацыю сацыяльна значных дзіцячых праектаў і ініцыятыў.

За значныя дасягненні ў сферы музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны спецыяльнай прэміяй адзначаны заслугі **ўзорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Беларусі.**

Сярод лаўрэатаў — **калектыў Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль».** Спецпрэмія яму прысуджана за вялікі ўклад у развіццё музейнай справы, рэалізацыю выставачных праектаў па захаванні гістарычнай памяці беларускага народа.

**Калектыў Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея** адзначаны спецыяльнай прэміяй за вялікі ўклад у развіццё народнай мастацкай творчасці, адраджэнне традыцый шапавальства.

Спецыяльнай прэміі ўдастоены таксама **калектыў Цэнтра народнай творчасці і рамёстваў у гарадскім пасёлку Копысь** за актыўную дзейнасць па захаванні тэхналогій стварэння вырабаў традыцыйнай керамікі Аршанскага раёна.

За выдатныя дасягненні ў выхаванні моладзі, рэалізацыю культурна-турыстычных праектаў прэміяй адзначаны заслугі **калектыву Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства.**

**Народны фальклорны калектыў «Таняжанка» Лельчыцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці** ўдастоены спецпрэміі за значныя дасягненні ў захаванні музычнай спадчыны, звычаяў і традыцый Палескага рэгіёна.

Сярод лаўрэатаў спецыяльнай прэміі таксама **творчая майстэрня эстраднага мастацтва «Хвілінка» Беларускага саюза музычных дзеячаў** — за высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных праектах патрыятычнай тэматыкі.

**Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» і Нацыянальны архіў Беларусі** ўдастоены спецпрэміі за значную работу па фарміраванні грамадскай свядомасці, папулярызацыю гісторыі партызанскага і падпольнага руху Беларусі.

### Каму прысуджана спецпрэмія «Беларускі спартыўны Алімп» 2022 года

За актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, спецыяльная прэмія прысуджана **Антону Смольскаму, Анастасіі Пракапенцы і Віктару Байкову.**

Капітан нацыянальнай каманды па біятлоне, майстар спорту міжнароднага класа Антон Смольскі — сярэбраны прызёр зімовых Алімпійскіх гульняў 2022 года, прызёр этапаў Кубка свету, пераможца і прызёр этапаў Кубка Садружнасці сезона 2021/2022, чэмпіён Еўропы па летнім біятлоне.

Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь Анастасія Пракапенка — шматразовая чэмпіёнка свету і Еўропы па сучасным пяцібор'і. Яна брала ўдзел у чатырох Алімпіядах, з'яўляецца бронзавым прызёрам Алімпійскіх гульняў 2008 года.

Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Віктар Байкоў з 1982 года працуе ў Гомельскім дзяржаўным вучылішчы алімпійскага рэзерву. Ён падрыхтаваў заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь Марыну Літвінчук — трохразовага прызёра Алімпійскіх гульняў (2012, 2016 і 2021 гады). Выхаваў цэлую плеяду спартсменаў высокага класа — пераможцаў і прызёраў чэмпіянатаў свету і Еўропы, сярод якіх 11 майстроў спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, 52 майстры спорту Рэспублікі Беларусь.

Знаёмімся з лаўрэатамі

# Гімназічныя класы плюс нядзельная школа

**Сярод лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» — калектыў Духоўна-асветніцкага цэнтра прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы. Гэта вынік амаль 15-гадовай культурна-асветніцкай дзейнасці прыхода, які цесна ўзаемадзейнічае з дзяржавай.**



Фота з сайта elisavetinskiprihod.by

— Каб атрымаць такую прэмію, трэба маліцца і працаваць, як гэта гучыць на латыні, — Ora et labora, — адзначае **дырэктар цэнтра Васіль БАРАНЧУК**. — Мы тройчы наміналіся на атрыманне прэміі, але прысудзілі нам яе толькі цяпер. Пра маштаб узнагароды можна меркаваць па нашых папярэдніках-лаўрэатах. Гэта шыкоўная работа мастакоў па роспісе храма ў Баркалабаўскім манастыры, якія ўпрыгожылі сцены біблейскімі сюжэтамі і вывамі беларускіх падзвіжнікаў. Гэтай жа прэміі ўдастоены і перакладчыкі Свяшчэннага Пісання на беларускую мову. Мы вельмі ганарымся, што наша дзейнасць таксама атрымала высокую ацэнку.

Усё пачалося з 2007 года, калі протаіерэй Аляксей Канаплёў, які, на жаль, ужо пайшоў з жыцця, прапанаваў арганізаваць вучобу пры духоўна-асветніцкім цэнтры. Ён даведаўся пра цікавы вопыт у Расіі, дзе на той час ужо дзейнічала 11-гадовая прыватная праваслаўная школа. Нешта падобнае, але менш маштабнае, мы паспрабавалі ўкараніць у нас. Гэты эксперымент мы праводзім разам з трэцяй гімназіяй Бабруйска. Ёсць сумесная дамоўленасць Бабруйскай епархіі і ўпраўлення адукацыі, спорту і турызму Бабруйскага гарвыканкама.

Для адукацыі дзяцей выкарыстоўваецца будынак, які быў адноўлены храмам дзе цяпер размяшчаецца дамавая царква, духоўна-асветніцкі цэнтр, паралельна працуюць гімназічныя класы, нядзельная школа...

Суразмоўнік удакладняе, што на сённяшні дзень у гімназічных класах займаюцца 72 дзіцяці, у нядзельнай школе — 130. Акрамя агульнаадукацыйных дысцыплін, якія ў гімназічных класах выкладаюць настаўнікі трэцяй гімназіі, хлопчыкі і дзяўчынкі вывучаюць Закон Божы з дапамогай клірыкаў.

— З 2007 года наш духоўна-асветніцкі цэнтр набірае абароты, уцягваецца ўсё больш людзей, — тлумачыць Васіль Баранчук. — З дзецьмі з нядзельнай школы займаюцца восем педагогаў. Заняткі праводзяцца яшчэ і па суботах, бо не хапае памяшканняў. І дзеці, і іх бацькі наведваюць богаслужэнні, прычашчаюцца. Храм, лічы, у цэнтры горада, шмат прыхаджан.

Дарэчы, цяпер пры духоўна-асветніцкім цэнтры ідуць падрыхтоўчыя курсы, пасля якіх па выніках гутаркі будуць адбірацца вучні для гімназічных класаў. Падрыхтоўчую групу вядзе настаўнік гімназіі, які потым будзе выкладаць у гэтых дзяцей. Праграма складзена з улікам усіх патрабаванняў Міністэрства адукацыі. Сёння ў падрыхтоўчай групе 35 чалавек, у першы клас з праваслаўным ухілам пойдзе каля 20.

Пры духоўна-асветніцкім цэнтры працуюць таксама лекторый для дарослых, аб'яднанні па інтарэсах, дзе моладзь мае магчымасць творча і ўсебакова развівацца. Тут жа працуе добра вядомы ў Бабруйску і не толькі праваслаўны тэатр «Убрус», якім кіруе рэжысёр Людміла Навумчык. Штогод гэты тэатр рыхтуе да Каляд і на Вялікдзень святочныя музычныя спектаклі, у якіх задзейнічана да 80 чалавек. І гэта не толькі ўдзельнікі тэатра, але і гараджане, сярод якіх ёсць нават кіраўнікі буйных бабруйскіх прадпрыемстваў.

У рэпертуары спектаклі пра вялікіх беларускіх асветнікаў і грамадскіх дзеячаў — Свяціцеля Георгія Каніскага, Прападобную Ефрасінню Полацкую. Сёлета 8 студзеня ў бабруйскім Палацы мастацтваў будзе паказана пастаноўка «Кірыл Тураўскі — Залатавуст Белай Русі». На яго запрошаны прадстаўнікі кіраўніцтва Бабруйска, Магілёва і вобласці.

Ёсць ужо планы і на прэмію, якая прысуджана прыходу.

— Мы робім якасныя спектаклі, і для іх стварэння нам патрэбна якасная тэхніка, — падкрэслівае дырэктар цэнтра. — Частка грошай пойдзе на набыццё фотавідэаапаратуры для нашых пастановак. У ходзе работы над імі нашы артысты з рэжысёрам выязджаюць на тыя месцы, пра якія ідзе гаворка ў спектаклі і дзе жылі галоўныя яго героі. Потым, падчас спектакля, паказваем знятыя кадры. Сёлета мы рабілі фота да пастаноўкі ў Тураве. Калі ставілі спектакль пра Ефрасінню Полацкую, выязджалі ў Полацк. Акрамя таго, мы здымаем своеасаблівыя «Ералашы» на выхаваўчыя тэмы. Апаратура, якой мы карысталіся, вельмі старая і, здаралася, падводзіла. Цяпер, дзякуючы прэміі, мы зможам вырашыць праблему.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# АЛЬМА-МАТАР ЮНЫХ АБАРОНЦАЎ І ПАТРЫЁТАЎ

**Прэміі «За духоўнае адраджэнне»удастоены ваенна-патрыятычны клуб «Рысь» вайсковай часці 3214 унутраных войскаў МУС. Такога высокага прызнання клуб удастоены за актыўную дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні падлеткаў. Усяго ва ўнутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў дзейнічае 17 ваенна-патрыятычных клубаў, якія функцыянуюць на тэрыторыі злучэнняў і воінскіх часцей. «Рысь» — першапраходзец: клуб быў створаны 3 кастрычніка 2021 года. На цяперашні момант яго выхаванцамі з'яўляюцца больш як 160 хлопчыкаў і дзяўчынак, якія вучацца абараняць Радзіму і быць патрыётамі.**



**Кіраўнік ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» маёр унутраных войскаў Руслан ШЫГ разам з жывым сімвалам і клуба, і вайсковай часці.**

Карэспандэнты «Звязды» аднымі з першых павіншавалі кіраўніцтва і выхаванцаў клуба з прысуджэннем прэміі «За духоўнае адраджэнне». Вядома, мы не маглі не спытаць, ці чакалі такой высокай ацэнкі людзі, якія сваёй штодзённай працай уносяць важкі ўклад у ваенна-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення.

— Не скажу, што прысуджэнне прэміі было нечаканасцю: мы да гэтага імкнуліся, — адзначыў **кіраўнік ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» маёр унутраных войскаў Руслан ШЫГ**. — Вельмі прыемна, што кіраўнік дзяржавы ацаніў нашу работу па ваенна-патрыятычным выхаванні. У далейшым будзем удасканальвацца, не падвядзём! Будзем рабіць яшчэ больш, яшчэ лепш!

Руслан Шыг — першы і адзіны кіраўнік ваенна-патрыятычнага клуба. «Рысь» стварауся на яго вачах. Ніякіх цяжкасцяў, па яго словах, не ўзнікала нават на першапачатковым этапе. «На працягу 20 гадоў вайсковая часць 3214 працуе з моладдзю ў плане грамадзянска-патрыятычнага выхавання, — удакладніў маёр унутраных войскаў. — Вопыт быў. Таму мы ведалі, чым зацікавіць школьнікаў. Толькі кінулі кліч па школах Першамайскага раёна, адгукнуліся першыя 80 чалавек. Затым спрацавала сарафаннае радыё. Дзеці бачылі фотаздымкі адно аднаго ў сацыяльных сетках, цікавіліся, прыходзілі і запісваліся. Так вельмі хутка клуб разросся, колькасць яго выхаванцаў павялічылася ў два разы».

Ваенна-патрыятычны клуб «Рысь» наведваюць дзеці з 9 да 17 гадоў. Зразумела, што хлопцаў тут больш — цяга да армейскага жыцця ў іх больш развіта чым у дзяўчат. Аднак і тых у клубе нямала. Дзяўчаты прыходзяць сюды матываванымі: большасць у далейшым планує звязаць сваё жыццё са службай Радзіме. У «Рысь» яны, як правіла, ідуць, каб пазнаёміцца з ладам армейскага жыцця.

— Мы не ўтойваем, што свае выхаванцаў арыентуем на паступленне ў ВНУ ваеннага профілю, — заўважае Руслан Шыг. — І гэта працуе: нашы першыя выпускнікі ўжо з'яўляюцца курсантамі факультэта ўнутраных войскаў Ваеннай акадэміі.

У цяперашні час сумесна з Міністэрствам адукацыі разглядаецца пытанне аб уняcенні дапаўненняў у пункт 26 Правілаў прыёму асоб для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі, зацверджаных Указам Прэзідэнта № 23. Гаворка ідзе аб ільготах выхаванцам ваенна-патрыятычных клубаў пры паступленні ў ваенные вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сёння такімі прывілеямі выхаванцы карыстаюцца пры паступленні ў Спецыялізаваны ліцэй МУС, суворaўскае і кадэцкія вучылішчы.

Заняткі ў ваенна-патрыятычным клубе «Рысь» праходзяць двойчы на тыдзень. Па дзве гадзіны ў будны дзень, па чатыры — у выхадны. Праграма настолькі разнастайная, што сумаваць падлеткам не даводзіцца. Падчас цыкла прадметаў «Я і мая Айчына» яны больш глыбока вывучаюць гісторыю роднага краю. З цікавасцю засвойваюць і прадметы пачатковай ваеннай падрыхтоўкі: агнявую, медыцынскую і агульнафізічную падрыхтоўку, рукапашны бой, ваенную тапаграфію, асновы бяспечнай жыццядзейнасці.

— Трапляючы ў армейскае асяроддзе, хлопцы і дзяўчаты становяцца больш дысцыплінаванымі, мэтанакіраванымі, — звяртае ўвагу кіраўнік ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь». — Пашыраецца кола іх інтарэсаў, дзеці становяцца больш самазанятымі, самастойнымі. Гэта адзначаем не толькі мы, але і іх бацькі. Павысіўся ў выхаванцаў і ўзровень школьнай адукацыі. У перыяд заняткаў у клубе ўсе дзеці, за рэдкім выключэннем, паднялі свой сярэдні бал. Адным словам, змяненні толькі пазітыўныя.

Сімвалам клуба, як і вайсковай часці 3214, з'яўляецца рысь. І не выдуманая, а самая што ні ёсць сапраўдная. Іх тут нават дзве — Фенікс і Фіёна. На пастаянные месца жыхарства на тэрыторыю вайсковай часці жывёлы «пераехалі» не з дзікай прыроды, а са спецыяльных гадавальнікаў. Да прыезду незвычайных «жыхароў» тут рыхтаваліся: вывучалі ўмовы іх пражывання ў заапарку, стварылі аналагічны вальер. Рацыён харчавання, вітаміны рысі атрымліваюць у поўным аб'ёме. «Як у заапарку, — заўважае Руслан. — Нават лепш!»

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва героя публікацыі.**

# Ад усёй душы — старэйшаму пакаленню

**Дабрачынная акцыя для людзей сталага веку «Ад усёй душы» стартавала ў Беларусі. Гэта была ініцыятыва кіраўніка дзяржавы, якую той агучыў на дабрачынным свяце, прысвечаным акцыі «Нашы дзеці».**

Галоўная мэта акцыі — праяўленне клопату і ўвагі да старэйшага пакалення, максімальнае ўцягванне школьнікаў і студэнтаў у аказанне дапамогі і падтрымкі, развіццё міжпакаленчага фармату «Ад дзяцей — пажылым людзям».

Для маладых людзей гэта новы вопыт, які дазволіць ім выявіць свае найлепшыя душэўныя якасці, а можа быць, і вызначыцца з будучай прафесіяй напярэдадні свята — Дня работнікаў сацыяльнай абароны.

Акцыя арганізавана Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Міністэрствам адукацыі сумесна з грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя».

Сёння ў краіне пражывае больш за 120 тысяч адзінокіх людзей сталага ўзросту, якія асабліва востра адчуваюць патрэбу ва ўвазе ў навагоднія святы. Пры гэтым яшчэ каля 20 тысяч пражывае ў стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання, а для 100 тысяч чалавек арганізаваны дзённы догляд і забаўляльная дзейнасць тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Асноўнымі мерапрыемствамі з 3 па 14 студзеня стануць віншаванні пажылых людзей ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, бальніцах сястрынскага догляду, а таксама падчас іх наведванняў дома. Абудуцца сустрэчы старэйшага і малодага пакаленняў у фармаце чаявання, круглых сталоў, будуць арганізаваны канцэрты, тэатралізаваныя паказы і інш. Асаблівая ўвага — доўгажыхарам, якія ў перыяд акцыі адзначаць свае юбілеі.

Павіншуюць пажылых людзей не толькі дзеці і моладзь, але і кіраўнікі мясцовых органаў улады, дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, дэпутаты. Далучыцца да гэтай важнай ініцыятывы зможа любы ахвотны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Сацыяльны вектар

# У АСНОВЕ — ДАБРАБЫТ ЛЮДЗЕЙ

## Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ — аб прыярытэтах бюджэтнай палітыкі сёлета

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у другім чытанні разгледзелі законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год». Асноўны фінансавы дакумент краіны на дзясятай сесіі адобрылі і члены Савета Рэспублікі. У цэлым расходы рэспубліканскага бюджэту на будучы год запланаваны ў аб'ёме 36,5 млрд рублёў, даходы — у 33,4 млрд рублёў. За гэтымі лічбамі — канкрэтныя праекты, накіраваныя на падтрымку нацыянальнай эканомікі, павышэнне дабрабыту грамадзян.**



***— Людміла Іванаўна, рэспубліканскі бюджэт на 2023 год сфарміраваны і ўжо адобраны парламентарыямі. Раскажыце, калі ласка, якая работа папярэднічала прадстаўленню асноўнага фінансавага дакумента краіны ў ніжняй палаце парламента?***

— Законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год», унесены ў Палату прадстаўнікоў Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 24 лістапада, прайшоў тры чытанні: нулявое (з удзелам прэм'ер-міністра), першае і другое. Праект закона быў прыняты парламентарыямі 20 снежня 2022 года. Гэтаму папярэднічалі пашыраные пасяджэнне Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах пры непасрэдным удзеле міністра фінансаў і яго намеснікаў, намеснікаў міністра па падатках і зборах, першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны насельніцтва, пасяджэнні з зацікаўленымі дзяржорганамі. Аднак удзел дэпутатаў у падрыхтоўцы праекта бюджэту не абмяжоўваецца сценамі парламента і такімі сціслымі тэрмінамі. На працягу ўсяго каляндарнага года дэпутаты, члены нашай камісіі, удзельнічаюць у рабоце кансультатыўнага савета па карэкціроўцы Падатковага кодэкса, з'яўляюцца членамі міжведамаснай рабочай групы па распрацоўцы прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэту, разглядаюць гэтыя пытанні на пасяджэннях прэзідыума Савета Міністраў. На працягу года ў адрас Міністэрства фінансаў, Міністэрства па падатках і зборах дэпутатамі накіроўваюцца з улікам практыкі прымянення і пытанняў, якія падымаюцца на месцах, прапановы па ўдасканаленні падатковага і бюджэтнага заканадаўства, шэраг з якіх знайшоў сваё адлюстраванне ў законах, прынятых летась. Штогод намі праводзяцца выязныя мерапрыемствы з удзелам спецыялістаў профільных міністэрстваў па вывучэнні практыкі прымянення дзеючага заканадаўства, разглядаюцца праблемныя пытанні фарміравання і выкарыстання мясцовых бюджэтаў. У 2022 годзе такі семінар быў праведзены на базе Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

***— З чаго будуць фарміравацца даходы бюджэту?***

— У 2023 годзе даходы кансалідаванага бюджэту ў цэлым прагназуюцца ў суме 57,2 млрд рублёў (24,2 % да ВУП). Даходы рэспубліканскага бюджэту 2023 года плануюцца ў памеры 33,4 млрд рублёў (14,1 % да ВУП) і ў параўнанні з ацэнкай паступленняў 2022 года павялічацца на 6,6 млрд рублёў (24,6 %). Даходы рэспубліканскага бюджэту ўключаюць: падатковыя даходы, з якіх найбольшая ўдзельная вага — 60 % — займае падатак на дабаўленую вартасць, акцызы, падатак на прыбытак, непадатковыя даходы, бязвыплатныя паступленні. У склад даходаў рэспубліканскага бюджэту ўключаны таксама даходы дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў.

***— На што ў асноўным будуць накіраваны расходы?***

— Расходы кансалідаванага бюджэту на 2023 год плануюцца ў суме 60,7 млрд рублёў, або 114,2 % да ацэнкі бягучага года, рэспубліканскага бюджэту — у суме 36,5 млрд рублёў, або 109,9 % да чаканага выканання 2022 года. Расходы кансалідаванага бюджэту на 2023 год на фінансаванне сацыяльнай сферы вызначаны ў памеры 27,2 млрд рублёў, або з ростам да чаканага выканання 2022 года на 17,7 %. З іх 10,4 млрд рублёў плануецца выдаткаваць на ахову здароўя, 10,3 млрд рублёў — на адукацыю. У эканамічнай структуры кансалідаванага бюджэту выдаткі на аплату працы (з узносамі) і пенсіі вайскоўцам складаюць 38,6 %. Фонд аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый (з узносамі) у кансалідаваным бюджэце запланаваны ў суме 15,6 млрд рублёў, з ростам на 2,3 млрд рублёў. Законапраектам «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год» прадугледжана перадаць трансферты бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на агульную суму 1,9 млрд рублёў, мясцовым бюджэтам — у агульнай суме 7,6 млрд рублёў. На фінансаванне будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай плануецца накіраваць больш за 1,6 млрд рублёў, на выплату «сямейнага капіталу» — 429,4 млн рублёў. Расходы на аказанне дзяржаўнай падтрымкі па сістэмных рашэннях (падтрымка экспарту і забеспячэнне ўнутранага рынку сучаснай тэхнікай і абсталяваннем) прадугледжаны ў памеры 1,1 млрд рублёў. На фінансаванне Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы запланавана накіраваць 806,3 млн рублёў. Расходы рэспубліканскага дарожнага фонду — ажыццявіць у памеры 1017,1 млн рублёў.

***— Атрымліваецца, расходы бюджэту-2023 перавышаюць даходы. За кошт чаго будзе пакрывацца дэфіцыт?***

— Дэфіцыт (перавышэнне расходаў над даходамі) рэспубліканскага бюджэту складзе 3 173,8 млн рублёў. Яго плануецца прафінансаваць за кошт астаткаў сродкаў рэспубліканскага бюджэту, знешніх дзяржаўных пазык, прыцягнення запазычанняў на ўнутраным рынку.

***— Нягледзячы на санкцыйны ціск, бюджэт захаваў сацыяльную накіраванасць...***

— У функцыянальнай структуры выдаткі кансалідаванага бюджэту прадстаўлены наступным чынам: ахова здароўя — 17 %, адукацыя — 16,9 %, сацыяльная палітыка — 7,9 %, фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі — 2,9 %. Такім чынам, выдаткі на сацыяльную сферу складуць каля 45 % сродкаў кансалідаванага бюджэту. Разам з тым, будзе прадоўжана рэалізацыя мерапрыемстваў па павышэнні заработнай платы работнікам бюджэтных арганізацый, працягнецца фінансавая дапамога дзяржавы маладым і шматдзетным сем'ям у пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах, кампенсацыя працэнтаў па крэдытах, выдадзеных на будаўніцтва жылля маючым патрэбу грамадзянам і шматдзетным сем'ям, прадугледжаны сродкі на развіццё інжынерна-транспартнай, энергетычнай інфраструктуры. У рамках рэалізацыі мерапрыемстваў па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС запланаваны ў рэспубліканскім бюджэце сродкі на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне грамадзян пацярпелых тэрыторый. Працягнецца праграма аказання дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей: у кансалідаваным бюджэце на гэтыя мэты прадугледжана 430,8 млн рублёў, з іх на фарміраванне сямейнага капіталу — 429,4 млн рублёў, што на 13 % вышэй, чым у 2022 годзе. Прадугледжаны цэнтралізаваны закуп спецыяльнага аўтатранспарта з наступнай перадачай абласным і Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам для навучальных устаноў, устаноў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, аўтамабіляў хуткай медыцынскай дапамогі. З улікам нарматываў патрэбнасці ў адукацыі прадугледжаны сродкі на выплату стыпендый вучням, утрыманне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, неабходнай для забеспячэння навучальнага працэсу і бяспечнай эксплуатацыі будынкаў. Бюджэтная палітыка ў галіне аховы здароўя будзе накіравана на фарміраванне сучаснай аховы здароўя, якая сумяшчае эфектыўную дзейнасць, рэалізацыю дзяржаўных гарантый шляхам павышэння даступнасці і якасці медыцынскай дапамогі насельніцтву.

***— Прадугледжана, што ў работнікаў бюджэтных арганізацый павысіцца заработная плата. Дзякуючы чаму гэта будзе магчыма?***

— Рост аплаты працы будзе забяспечаны за кошт павелічэння базавай стаўкі на 10 %, павышэння асобным катэгорыям работнікаў бюджэтнай сферы стымулюючых выплат у адпаведнасці з прынятай Праграмай дзейнасці ўрада да 2025 года на 55 %. Акрамя таго, праектам закона прадугледжана стварэнне дадатковага рэзервовага фонду Прэзідэнта ў памеры Br394 млн, сродкі якога пры выкананні прагнозных паказчыкаў у першую чаргу будуць накіроўвацца на павышэнне аплаты працы. Аналагічныя фонды рэкамендуецца стварыць у мясцовых бюджэтах. Гэтыя меры дадуць магчымасць забяспечыць сярэднямесячную заработную плату работнікам бюджэтнай сферы ў памеры 1454 рублёў, або 75 % ад заработнай платы па краіне.

***— Адна з асаблівасцяў рэспубліканскага бюджэту 2023 года — новыя субвенцыі. Якія сферы змогуць на іх разлічваць?***

— З 2023 года ў рэспубліканскім бюджэце ўводзіцца новы від субвенцый, накіраваных на падтрымку сельскай гаспадаркі. Гэта сродкі на закупку мінеральных угнаенняў, правядзенне культуртэхнічных мерапрыемстваў, набыццё меліярацыйнай і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі неплацежаздольным сельскагаспадарчым арганізацыям. Усяго на гэтыя мэты мяркуецца накіраваць 190 млн рублёў сродкаў рэспубліканскага бюджэту. 50 млн рублёў плануецца перадаць у выглядзе субвенцый абласцям на бягучы рамонт вулічна-дарожнай сеткі населеных пунктаў. Акрамя таго, на фінансаванне грамадзянскіх ініцыятыў прадугледжана накіраваць 700 тысяч рублёў: па 100 тысяч рублёў кожнай вобласці і Мінску.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Ватыкане развітваюцца з Бенядзіктам XVI

**Амаль 65 тысяч чалавек наведала 2 студзеня каталіцкі сабор Святога Пятра ў Ватыкане, каб развітацца з Папам Рымскім, на спачынку Бенядзіктам XVI. Пра гэта паведамляе тэлеканал «МІР24» са спасылкай на ватыканскую жандармерыю.**



Развітванне з Бенядзіктам XVI праходзіла таксама 3-га і яшчэ будзе праходзіць 4 студзеня, а 5-га адбудзецца пахаванне. Памінальную імшу, якая пройдзе ў гэты дзень на плошчы Святога Пятра, узначаліць цяперашні кіраўнік Рымска-каталіцкай царквы Францыск.

Планавалася, што сабор Святога Пятра будуць наведваць каля 30-40 тысяч вернікаў за дзень.

Бенядзікт XVI пайшоў з жыцця 31 снежня 2022 года ва ўзросце 95 гадоў. На папскі прастол узышоў у 2005 годзе, а ў 2013 годзе стаў першым за 600 гадоў пантыфікам, які склаў з сябе паўнамоцтвы з-за стану здароўя.

## Прэм'ер Польшчы заявіў аб недапушчальнасці праслаўлення Украінай Бандэры

**Кіраўнік польскага ўрада Матэвуш Маравецкі заявіў, што пры першай жа сустрэчы з прэм'ерам Украіны Дзянісам Шмыгалём нагадае яму аб недапушчальнасці праслаўлення лідара Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў Сцяпана Бандэры. Аб гэтым польскі палітык напісаў на сваёй старонцы ў Twitter.**

Раней Вярхоўная рада Украіны апублікавала ў Twitter інфармацыю аб дні нараджэння Бандэры. Адказваючы на пытанне аб рэакцыі польскіх улад на гэтую публікацыю, Маравецкі падкрэсліў, што лічыць такія дзеянні недапушчальнымі.

«Мы вельмі крытычныя ў адносінах да якога-небудзь усхвалення ці нават згадвання пра Бандэру. У маёй першай размове з прэм'ерам Дзянісам Шмыгалём я скажу пра гэта вельмі-вельмі адназначна», — напісаў прэм'ер-міністр Польшчы, дадаўшы, што Бандэра быў «ідэолагам злачынных часоў».

Раней улады ўкраінскага Ізюма паведамілі аб перайменаванні вуліц Пушкінскай і Суворава ў гонар Бандэры і Пятлюры.

## Астраном Шаўчэнка расказаў аб залежах на Месяцы сыравіны для экранаў смартфонаў

**Месяц можа стаць перспектыўнай крыніцай сыравіны для вытворчасці сэнсарных экранаў тэлефонаў. Такое меркаванне выказаў Уладзіслаў Шаўчэнка, загадчык аддзялення даследаванняў Месяца і планет Дзяржаўнага астранамічнага інстытута імя Штэрнберга МДУ імя Ламаносава.**

Вядучыя касмічныя дзяржавы плануюць пабудаваць базы на Месяцы на працягу наступнага дзесяцігоддзя. Сярод прычын іх будаўніцтва, апрача навуковых даследаванняў, называюць здабычу карысных выкапняў. Гэта будзе дорага. Аднак касмічнай здабычы можа не быць альтэрнатывы пры поўным вычарпанні зямных запасаў шэрагу мінералаў.

«Зямныя запасы многіх рэдказямельных металаў групы лантаноідаў ужо блізкія да вычарпання, кансалтынгавыя фірмы сцвярджаюць, што разведаныя запасы скончацца праз некалькі дзесяцігоддзяў. Лантаноіды неабходныя для многіх высокатэхналагічных прылад: напрыклад, у склад сэнсарных экранаў тэлефонаў уваходзяць індый, запасы якога вельмі малыя», — лічыць Шаўчэнка.

Менавіта індый надае сэнсарнаму экрану яго ўласцівасці. Зараз вытворцы смартфонаў шукаюць аналагі гэтага металу, але калі якаснай замены знайсці не ўдасца, імпарт з Месяца можа стаць добрай альтэрнатывай.

# Чаму важна бачыць гледача

## Як у нашай краіне вывучаюць густы спажыўцоў масавай інфармацыі



**У красавіку 2020 года ў Беларусі была створана нацыянальная сістэма медыявымярэнняў, якая займаецца зборам, аналізам, захаваннем і распаўсюджваннем звестак пра перавагі гледачоў і слухачоў тэлебачання і радыё. Гэту падзею чакалі, на яе ўскладаюць вялікія надзеі. «Звязда» пазнаёмілася з тым, як працуе гэта сістэма і як яна ўплывае на якасць медыяпрадукту.**

### АПЕРАТАР

Для дзяржавы вельмі важна стварэнне ў краіне медыявымярэння сусветнага ўзроўню, бо яна зацікаўленая ў развіцці рэкламнага рынку і падтрымцы тэлевізійнай галіны. Адна з умоў, якая забяспечвае такі ўзровень, — дзяржаўна-прыватнае партнёрства і наяўнасць адзінага нацыянальнага медыявымяральніка. З гэтай мэтай было створана закрытае акцыянернае таварыства «МедиаИзмеритель», дзейнасць якога рэгулюе Міністэрства інфармацыі. Новае прадпрыемства ўзнікла не на пустым месцы — яго заснавальнікам стала СЗАТ «Бяспечныя дарогі Беларусі», якое на той момант ужо мела дзесяцігадовы вопыт дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

«Гэта высокатэхналагічная, вельмі эфектыўная і празрыстая структура, — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «МедиаИзмеритель» Уладзімір ШАФАРЭНКА.** — Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Рахманаў у свой час высока ацаніў тэхналогіі «Бяспечных дарог». Касманаўт Алег Навіцкі быў вельмі ўражаны, калі яму расказалі, што датчыкі фотафіксацыі ў Беларусі робяць за секунду 1400 вымярэнняў. Па яго словах, хуткасць камер на касмічнай станцыі ўдвая меншая».

### ПАРТНЁРСТВА

Рэйтынгі тэлеперадач вымяраліся ў нашай краіне і раней, але рынак медыярэкламы падаў, і адна з прычын — недастатковы ўзровень даверу тым рэйтынгам. Такі стан справы не задавальняў ні тэлеканалы, ні дзяржаву, ні патэнцыйных рэкламадаўцаў.

«Бізнес зацікаўлены ў эфектыўным выдаткоўванні сродкаў, у тым ліку рэкламнага бюджэту. З аднаго боку, бізнес не жадае пераплачваць, з другога — рэклама не павінна надакучваць, — патлумачыў **першы намеснік генеральнага дырэктара Coca-Cola HBC Belarus Андрэй РАШЧУПКІН.** — Каб стаць падставай для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў з боку бізнесу, інструменты медыявымярэння павінны быць надзейнымі і дакладнымі».

Група кампаній Coca-Cola Hellenic працуе ў 28 краінах, у Беларусі — з 1994 года. Для кіраўніцтва кампаніі было відавочна, што паміж інструментамі, якія выкарыстоўваюць калегі з іншых краін у сваёй рэкламнай палітыцы, і тымі, якія меліся да нядаўняга часу ў Беларусі, дыстанцыя вялізнага памеру, заўважыў Андрэй Рашчупкін. І дадаў: «Цяпер гэта дыстанцыя значна скарацілася».

«МедиаИзмеритель» заключыў кантракт з сусветным пастаўшчыком тэхналогіі ў галіне медыявымярэння Kantar Media UK Limited (Вялікабрытанія), а таксама з кампаніямі гэтай групы ў Турцыі і Іспаніі на пастаўку абсталявання, перадачу праграмнага забеспячэння і аказанне паслуг па падтрымцы тэхналогій. Працэс у Беларусі быў запушчаны ў рэкордна кароткія тэрміны, нягледзячы на тое, што супаў з абмежаваннямі, абумоўленымі сусветнай пандэміяй Covid-19. Іншым краінам для старту патрабавалася не менш за 18 месяцаў, «МедиаИзмеритель» справіўся за дзевяць.





У фінансаванні праекта ўдзельнічае Беларускі інавацыйны фонд, кампанія-аператар таксама з'яўляецца рэзідэнтам Парка высокіх тэхналогій. Але знайсці грошы, наладзіць сучасную тэхніку і ўсталяваць праграмы ў такой справе недастаткова. Вядучую скрыпку ў медыявымярэнні выконвае сацыялогія.

### САЦЫЯЛОГІЯ

Сацыялагічныя даследаванні для вывучэння аўдыторыі СМІ патрабуюцца досыць грунтоўныя, ад іх залежыць выбар хатніх гаспадарак для ўсталявання піплметраў — прыбораў, якія фіксуюць, хто і што глядзіць па тэлебачанні. «МедиаИзмеритель» не знайшоў сацыялагічную службу, якая справілася б з пастаўленай задачай, і стварыў уласны цэнтр даследаванняў.

Па сацыялагічнай выбарцы ствараецца маршрут для пошуку людзей, з якімі заключаецца дамова. Анкета змяшчае інфармацыю пра ўзрост, узровень матэрыяльнай забяспечанасці і сацыяльны статус кожнага тэлегледача. У вызначаных хатніх гаспадарках усталёўваюцца піплметры з пультам, які прадугледжвае фіксацыю прагляду перадач кожным чалавекам у доме. На не залежныя адзін ад аднаго серверы паступае інфармацыя пра тое, хто глядзіць тэлевізар, на які канал пераключыўся. Інфармацыя пра хатнія гаспадаркі, у якіх усталяваныя піплметры, закрытая, каб пазбегнуць уплыву на выбар гледачоў і слухачоў з боку тэле- і радыёканалаў.

Такім чынам вывучаюцца перавагі тэлегледачоў у Мінску, абласных і раённых цэнтрах. Выбарка медыявымяральніка — 550 хатніх гаспадарак. Штогод пералік хатніх гаспадарак, у якіх стаіць вымяральнае абсталяванне, абнаўляецца да 25 працэнтаў.

### КАРЦІНА

Сёння на сайце адзінага нацыянальнага медыявымяральніка можна азнаёміцца з тым, хто і як глядзіць беларускае тэлебачанне. Напрыклад, па даных з 12 па 18 снежня, сярод гледачоў тэлебачання 63 працэнты склалі жанчыны і 37 — мужчыны. Самая вялікая доля з іх — людзі сярэдняга ўзросту, з 35 да 54 гадоў (30 працэнтаў), трохі менш — старэйшыя за 65 гадоў (29 працэнтаў), моладзь — 13 працэнтаў, дзеці — 8. У сярэднім штодня глядзела тэлебачанне амаль 61 працэнт беларусаў.

Медыявымяральнік валодае інфармацыяй, колькі людзей у сярэднім у любы момант за адпаведны перыяд глядзіць той або іншы тэлеканал. Вывучаецца і дынаміка гэтага паказчыка ў адносінах да папярэдняга тыдня. Яшчэ адзін паказчык — доля тэлеканалаў, якія глядзелі, калі за 100 працэнтаў бярэцца колькасць усіх каналаў. Тут таксама адсочваецца дынаміка. Вымяраецца сярэднясутачнае (і за тыдзень) ахопліванне тэлеканала: колькі гледачоў сачылі за той або іншай эфірнай падзеяй цягам хвіліны. Гэта дазваляе заўважыць, як на тэлеглядзенне ўплывае сезоннасць: наступленне халадоў, школьныя канікулы, уздым рэспіраторных захворванняў і іншае.

Адлюстроўвае справаздача і сярэдні час прагляду. Напрыклад, тэлегледачы з 12 да 18 снежня ў сярэднім на працягу сутак аддалі 67 хвілін свайго часу тэлеканалу АНТ. Па выніках вымярэння складаецца топ-15 тэлепраграм (розных каналаў) па рэйтынгу, а таксама топ праграм на кожным тэлеканале. Напрыклад, на «Беларусь 1» самая рэйтынгавая праграма была — «Фактар.BY», а самая папулярная праграма сярод усіх каналаў — «Прывітанне, Андрэй!» («РТР-Беларусь»).

Медыявымяральнік складае топ жанраў і папулярнае попыт на жанры з прапановай. Такім чынам можна высветліць, што попыт на кіно і інфармацыйныя праграмы перавышае прапанову, амаль супадае на пазнавальныя праграмы і невялікі на музычныя. Гэта інфармацыя — падказка тэлеканалу, чым запаўняць свой эфір.

Вымяральнік аўдыторыі валодае інфармацыяй, як мяняецца глядацкая актыўнасць на працягу сутак, наколькі гледачы той або іншай катэгорыі цікавяцца тэлебачаннем. Справаздача дэманструе перавагі пэўнай аўдыторыі адносна тэлеканалаў. Напрыклад, «Беларусь 5» глядзіць пераважна мужчыны, а ВТБ — моладзь.

«Спажыўцамі нашых даных з'яўляюцца тэлевізійныя сродкі масавай інфармацыі, радыёстанцыі, рэкламныя агенцтвы ў асобе ТАА «Індустрыяльныя рашэнні», з якім мы заключылі дагавор. Падобная схема працы дазваляе выключыць залежнасць вымяральніка ад медыяхолдынгаў або дзяржавы», — каментуе Уладзімір Шафарэнка.

Атрыманыя звесткі — інструмент для паляпшэння ўзроўню кантэнту тэлеканалаў. Ён дазваляе бачыць, што падабаецца гледачу, якая аўдыторыя спажывае медыяпрадукт. Другі аспект — празрыстая, дакладная і аб'ектыўная інфармацыя для рэкламадаўцаў. Медыявымяральнік дае магчымасць праверыць, ці сапраўды былі выпушчаны ўсе аплачаныя рэкламныя ролікі. Ён таксама фіксуе, якая аўдыторыя іх бачыла, чула, колькі разоў.

### РАЗВІЦЦЁ

«Спачатку мы запусцілі сваю сістэму для вывучэння 22 тэлеканалаў. Гэта былі пераважна беларускія СМІ, і яны займалі каля 50 працэнтаў у пірагу тэлеглядзення. Пазней, сумесна з нашымі брытанскімі калегамі, мы знайшлі тэхналогію, якая дазволіла зазірнуць у другую палову пірага. У тэставым рэжыме прааналізавалі каля 140 тэлеканалаў, выбралі з іх 60, якія займаюць 97 працэнтаў да ўсяго тэлеглядзення. Завялі гэтыя тэлеканалы ў нашу сістэму вымярэнняў. У выніку атрымалі інфармацыю, якая карысная не толькі для тэлевізійных сродкаў масавай інфармацыі і рэкламных агенцтваў, але і для дзяржаўных органаў і аператараў электрасувязі, якія прапануюць паслугі тэлебачання насельніцтву, а таксама дыстрыб'ютараў тэлеканалаў на тэрыторыі Беларусі. Толькі мы можам даць краінавы зрэз глядзення таго ці іншага тэлеканала», — расказаў **генеральны дырэктар ЗАТ «МедиаИзмеритель» Уладзімір БАБЦОЎ.**

Сёння «МедиаИзмеритель» сумесна з РУП «Белтэлекам» працуе над тэхналогіяй апрацоўкі звестак, што атрымліваюцца з прыставак лічбавага тэлебачання. Тэхналогія дазволіць значна павысіць дакладнасць вымярэнняў тэлевізійнай аўдыторыі, атрыманых традыцыйным метадам піплметраў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

---

Надвор'е

## Маразы, снег і галалёдзіца

**Рэзкае пахаладанне да мінус 23 градусаў, снег і галалёдзіца прагназуюцца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Павышаны для пачатку месяца тэмпературны рэжым 4 студзеня захаваецца. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, днём месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег). Ноччу і раніцай чакаецца слабы туман. На асобных участках дарог галалёдзіца. У начны час месцамі адбудзецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

У чацвер, 5 студзеня, чакаюцца складаныя ўмовы надвор'я: працяглыя ападкі (снег, мокры снег, дождж), месцамі моцныя ападкі, наліпанне мокрага снегу, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Днём месцамі па паўднёвым захадзе будзе ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ноччу мінус 3 — плюс 3 градусы, па паўднёвым захадзе — да 5 градусаў цяпла. Днём будзе 0 — плюс 7 градусаў, у паўднёва-заходніх і паўднёвых раёнах да 9 градусаў цяпла, а па паўночным усходзе — 1—3 градусы марозу.



Паводле інфармацыі сіноптыкаў, 6 студзеня чакаецца рэзкае пахаладанне. Уначы і раніцай часам прагназуецца мокры снег, снег, слабая мяцеліца. Днём толькі месцамі па захадзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе ў межах ад 0 градусаў па паўднёвым захадзе да 14 градусаў марозу па паўночным усходзе. Ноччу па поўначы пры ўмове праяснення маразы ўзмоцняцца да 16 градусаў.

На праваслаўныя Каляды маразы ўзмоцняцца яшчэ больш. У суботу, 7 студзеня, пераважна па паўднёва-заходняй частцы краіны чакаецца снег, мокры снег, слабы галалёд. Ноччу будзе ад мінус 18 градусаў па паўночным усходзе да мінус 2 градусаў па паўднёвым захадзе краіны, падчас праясненняў не выключана паніжэнне да 19—23 градусаў марозу. Удзень — мінус 6—13 градусаў, месцамі 15 градусаў марозу, і толькі па паўднёвым захадзе краіны будзе мінус 5 — плюс 1 градус.

У нядзелю, 8 студзеня, ноччу месцамі пройдзе кароткачасовы снег, днём прагназуецца пераважна без ападкаў. Уначы тэмпература паветра складзе ад мінус 18 градусаў па паўночным усходзе да мінус 2 градусаў па паўднёвым захадзе, пры праясненнях будзе да 19—23 градусаў марозу. Днём чакаецца мінус 6—13 градусаў, па паўднёвым захадзе мінус 5 — плюс 2 градусы.

Паводле папярэдняга прагнозу сіноптыкаў, марознае надвор'е будзе пераважаць на тэрыторыі краіны да канца першай дэкады студзеня.

---

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні намесніку галоўнага рэдактара газеты «Звязда» Ручанаву Сяргею Валер'евічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества Общественного объединения «ПОЛЬСКА МАТЕЖ ШКОЛЬНА» (УНП 500446160), объявляет о проведении **03.02.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/12/spisok-imushhestva-polska-matezh-shkolna.pdf**

Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Городничанская, 40.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОО «ПМШ», тел. +375336712674.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток не позднее 17.00 **02.02.2023 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 04.01.23 по 17.00 02.02.23** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор по лоту № 1 – 0,5 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по лоту № 2 – 10 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение 30 календарных дней с даты проведения электронных торгов.

---

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 08-12/2022 эм

## Изменения

### в Проспект эмиссии жилищных облигаций седьмого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций седьмого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 20.08.2021 № 01-08/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

---

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 09-12/2022 эм

## Изменения

### в Проспект эмиссии жилищных облигаций восьмого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций восьмого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 20.08.2021 № 02-08/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

---

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17 | |
| **Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by | |
| Предмет аукциона**: жилой дом** (здание одноквартирного жилого дома), общ. пл. 31,4 кв. м, инв. № 240/С-45145, адрес: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, д. Сармацк, ул. Центральная, 7. ***Сведения о земельном участке:*** земельный участок общей площадью 0.2499 га предоставлен продавцу для обслуживания одноквартирного жилого дома на праве аренды до 08.10.2064. Начальная цена без НДС: **3 886,49 бел. руб. (снижена на 50 %).** Шаг торгов составляет 5 % от текущей цены предмета аукциона | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки». | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лота в течение **3 дней** после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 15.12.2022г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **16.01.2023** с **11.00** до **13.00**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.01.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «АСБ Лизинг».

Аукцион состоится **23.01.2023 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

**Лот № 1:** изолированное помещение № 1 здания строительного рынка с инв. № 600/D-83134, 1379,9 кв. м. Адрес: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 14/1-1, район аг. Озерцо. Обременения – аренда. Начальная цена с НДС 20 % – 879 164,12 руб. Задаток – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 19.01.2023 в 11.00

**☎ Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 10-12/2022 эм

## Изменения

### в Проспект эмиссии жилищных облигаций девятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций девятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 20.08.2021 № 03-08/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц информацию о внесении изменений и дополнений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений и машино-мест в составе объекта **«Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилые дома №24а, 24б по генплану. Очередь строительства 5.1. Жилой дом №24а по генплану, гараж-стоянка 24а-1 по генплану**, опубликованную в газете «Звязда» от 27.08.2021 №164 (29533) в редакции извещений о внесении изменений и дополнений от 15.09.2021 № 177 (29546), от 07.10.2021 №193 (29562), от 27.05.2022 №102 (29724), от 21.07.2022 №141 (29763), от 06.08.2022 №153 (29775), от 06.09.2022 №174 (29796) и от 16.12.2022 №247 (29869):

**Объект долевого строительства – квартира с машино-местом.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Срок начала строительства объекта – 30 июля 2021 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта – 23 месяца.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектом организации строительства – 29 июня 2023 года.

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой» по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без направлений администраций районов г. Минска:**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования настоящих изменений и дополнений в декларацию по объекту предлагается **35 однокомнатных квартир** с выполнением внутренних черновых отделочных работ:

**34 однокомнатные квартиры** с учетом приобретения машино-места на четвертом уровне (эксплуатируемая кровля) в гараже-стоянке 24а-1 по генплану в составе объекта строительства, в том числе:

13 (тринадцать) квартир общей площадью 40,27 кв. метров каждая: №№ **78** (совместно с машино-местом № 151), **83** (совместно с машино-местом № 152), **98** (совместно с машино-местом № 153), **108** (совместно с машино-местом № 154), **113** (совместно с машино-местом № 155), **202** (совместно с машино-местом № 156), **217** (совместно с машино-местом № 157), **222** (совместно с машино-местом № 158), **251** (совместно с машино-местом № 159), **266** (совместно с машино-местом № 160), **276** (совместно с машино-местом № 161), **296** (совместно с машино-местом № 162), **306** (совместно с машино-местом № 163);

9 (девять) квартир общей площадью 40,84 кв. метров каждая: №№ **129** (совместно с машино-местом № 164), **134** (совместно с машино-местом № 165), **188** (совместно с машино-местом № 166), **193** (совместно с машино-местом № 167), **203** (совместно с машино-местом № 168), **223** (совместно с машино-местом № 169), **262** (совместно с машино-местом № 170), **267** (совместно с машино-местом № 171), **277** (совместно с машино-местом № 172);

11 (одиннадцать) квартир общей площадью 43,35 кв. метров каждая: №№ **80** (совместно с машино-местом № 173), **95** (совместно с машино-местом № 174), **130** (совместно с машино-местом № 175), **189** (совместно с машино-местом № 176), **194** (совместно с машино-местом № 177), **204** (совместно с машино-местом № 178), **219** (совместно с машино-местом № 179), **224** (совместно с машино-местом № 180), **229** (совместно с машино-местом № 181), **288** (совместно с машино-местом №182), **313** (совместно с машино-местом № 183);

1 (одна) квартира № **9** общей площадью 49,54 кв. метров (совместно с машино-местом № 184).

**1 (одна) квартира № 13** общей площадью 49,54 кв. метров с учетом приобретения машино-места № 275, расположенном на шестом уровне (эксплуатируемая кровля) в гараже-стоянке 24б-1 по генплану.

Цены на объекты долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади жилых помещений для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, с учетом нормируемой общей площади жилого помещения – **2 090,12** рубля;

стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства в отношении площади, превышающей нормируемую для жилых помещений, – **3 090,00** рублей;

стоимость машино-места в гараже-стоянке 24а-1 по генплану составляет **23 395,76** рубля;

стоимость машино-места № 275 (общей площадью по СНБ 13,8 кв. метра) в гараже-стоянке 24б-1 по генплану составляет **23 480,84** рубля.

Ограниченная прибыль (кроме многодетных семей) устанавливается в пределах нормативной площади, которая составляет 15 кв. м в г. Минске на дольщика, а также на каждое лицо, состоящее на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий и осуществляющее строительство объекта долевого строительства совместно с дольщиком (при строительстве для одного человека однокомнатной квартиры – 30 кв. м).

**Условия оплаты для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.**

При условии оплаты согласно графику платежей к договору создания объектов долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению и машино-месту составляет 50 % от стоимости объектов долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей к договору. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

Оплата по машино-месту № 275 в гараже-стоянке 24б-1 по генплану производится единовременно в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

**Для заключения договоров с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без направлений администраций районов г. Минска необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;
- справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска **со сверкой учетных данных**;
- либо справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы в г. Минске (дополнительно представляется выписка из протокола заседания жилищной комиссии организации об основании постановки на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий со сверкой учетных данных).

Справка действительна в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты ее выдачи.

Заявления о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) в порядке живой очереди через 5 календарных дней с учетом наличия справки о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске **со сверкой учетных данных** либо справки о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы в г. Минске (дополнительно представляется выписка из протокола заседания жилищной комиссии организации об основании постановки на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий со сверкой учетных данных), а договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящего извещения по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 (режим работы: пн-чт – 8.30 до 17.45, пт – с 8.30 до 16.30, обед – с 13.00 до 14.00, тел.: 8 (017) 327-52-36, 8 (017) 226-03-01, 8 (029) 195 18 21) непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

## У меню... таблеткі

### Якія прэпараты дапамогуць пасля навагодняга застолля?

**Святочная вячэра, потым сняданак, які перацякае ў абед, і зноў вячэра... Першым чынам гэта сур'ёзная нагрузка на стрававальную сістэму. Яна пачынае здаваць нават у самых здаровых. Таму ўрачы не супраць, калі вы будзеце дапамагаць ёй некаторымі лекамі. Зразумела, што гаворка ідзе пра так званыя безрэцэптурныя прэпараты, якія прадаюцца ў аптэках.**

**Што мусіць быць у вашай аптэчцы, каб зберагчы сябе і блізкіх ад цяжкіх наступстваў застолля, расказвае афіцыйны тэлеграм-канал «Белфармацыі».**



Гэтыя прэпараты, якія вырабляюцца ў Беларусі, пажадана мець па рукой і падчас свят, і ў любы іншы час.

Лекавыя сродкі: ад пякоткі — алюгель;

ферментныя прэпарат (каб дапамагчы рабоце падстраўнікавай) — панкрэацін;

прэпараты для зняцця спазмаў кішэчніка і жоўцевывадзячых шляхоў — платаверын, мебеверын;

пры метэарызме — сімет.

Калі прысмакі справакавалі прыступ алергіі, на дапамогу прыйдуць:

антыгістамінныя прэпараты — хлорапірамін, цэцырызін, алеркапс, цэтрын,ларатадзін.

Навагодні стол тоіць у сабе небяспекі і пасля свята. Пры пакаёвай тэмпературы стравы хутка псуюцца, недалёка і да атручвання.

Спыніць дыярэю і вывесці таксіны дапамогуць:

прэпараты-энтэрасарбенты — дыяктыт, смектыка «Мёд», смект «Э», смектасорб, ультрасмекцін, энтэрасгель, вугаль актываваны-УБФ.

Здараецца і так, што працу нельга пакінуць ні на адзін дзень, і са святочнага застолля даводзіцца адпраўляцца на працоўныя подзвігі. А тут баліць галава.

На дапамогу прыйдзе нешта адно: цытрамон, анальгін, ібупрафен МАХ, спазматон. Але яны не сумяшчальныя з алкаголем!

А вось у выпадку сур'ёзных праблем і траўм абавязкова звяртайцеся да ўрачоў, якія дапамогуць падабраць комплекснае лячэнне і аднавіць здароўе.

Скажыце, доктар...

# ЛЕЧЫМ ГАЙМАРЫТ БЕЗ ПАМЫЛАК

### Ці варта грэць і як прамываць?

**Захварэць на гаймарыт можа кожны, але ў асноўную групу рызыкі ўваходзяць людзі, якія ўвесь час прастуджваюцца, пакутуюць ад хранічнага насмарку, маюць парушэнні імунітэту або няправільнае развіццё анатамічных структур поласці носа.**

**Гаймарыт — гэта запаленне слізістай абалонкі верхнясківічных прыдаткавых пазух носа.**

**У працэс запалення могуць уцягвацца адна або абедзве гаймаравы пазухі. Даволі часта гаймарыт пачынаецца пасля працяглага насмарку ці прастуды, якія былі не да канца далечаны.**

**Як своечасова заўважыць гаймарыт і вылечыць яго? Што прыводзіць да хранічнай формы?**

**І ці можна пры гаймарыце грэць нос? Пра гэта размаўляем з отарыналарынголагам 11-й гарадской паліклінікі Мінска Дар'яй ЧФАС.**



***— Дар'я Алегаўна, як адрозніць гаймарыт ад звычайнага насмарку? Якія відавочныя сімптомы гаймарыту?***

— Гаймарыт суправаджаецца галаўным болем, пачуццём распірання ў праекцыі верхнясківічных пазух (пацыент гэта адчувае ў шчоках), пачуццём ціску ў пераноссі, верхніх зубах, дыскамфортам пры нахіле галавы наперад, слізістагнойнымі выдзяленнямі з носа, павышэннем тэмпературы цела, сціканнем гною па задняй сценцы глоткі.

***— Што прыводзіць да гаймарыту? Захварэць можа кожны, альбо ёсць пэўныя групы рызыкі?***

— Часцей за ўсё гаймарыт узнікае як ускладненне прастудных інфекцыйных захворванняў, такіх як грып і ВРВІ. Спрыяць узнікненню і развіццю гаймарыту могуць паніжаны імунітэт, асаблівасці будовы насавых хадоў (напрыклад, скрыўленая насавая перагародка), схільнасць да алергічнага насмарку, павышаная адчувальнасць вегета-сасудзістай сістэмы да раздражняльнікаў — так званы вазаматорны рыніт.

***— Ці праўда, што маладыя людзі хварэюць часцей, чым пажылыя?***

— Да гаймарыту схільныя людзі абсалютна розных узростаў.



***— Як лячыцца гаймарыт і ці абавязкова прымаць антыбіётыкі?***

— Для лячэння гаймарыту неабходны прыём антыбіётыкаў, антыгістамінных прэпаратаў, сасудазвужальных кропель для зняцця ацёку слізістай носа, прэпарату для разрэджвання гною ў пазухах (сінупрэт, АЦЦ), а таксама прамыванне гаймаравых пазух (апаратнае прамыванне з выкарыстаннем адмоўнага ціску «Зязюля») і прамыванне носа солевым растворам. А пры неэфектыўнасці медыкаментознага лячэння робіцца пракол гаймаравай пазухі.

***— Што важна ведаць, каб захворванне не перайшло ў хранічную форму?***

— Да хранічнага гаймарыту могуць прыводзіць захворванні зубоў верхняй сківіцы, грыбковае паражэнне верхнясківічнай пазухі (грыбковае цела, або міцэтома), дабраякасныя і злаякасныя пухліны. Пухліна перашкаджае адтоку слізі, а яе клеткі выпрацоўваюць рэчывы, якія выклікаюць запаленне ў навакольных тканках. Таксама да хранічнага гаймарыту вядуць інфекцыі, алергіі, анамаліі будовы поласці носа і калянасавых пазух.

***— Пры лячэнні гаймарыту ці можна прыкладваць цяпло, дыхаць над парай?***

— Пры лячэнні гаймарыту нельга грэць нос і калянасавыя пазухі, бо цяпло толькі ўзмоцніць ацёчнасць. Нельга наведваць лазні і сауны.

***— Якая прафілактыка гаймарыту?***

— Яна накіравана на ўмацаванне агульнага імунітэту. Для гэтага варта займацца спортам і іншымі відамі фізічнай актыўнасці, апранацца адпаведна надвор'ю, часцей бываць на свежым паветры. Таксама старайцеся збалансавана харчавацца, адмовіцца ад шкодных звычак. Важна своечасова лячыць прастудныя захворванні і хранічныя хваробы насаглоткі, сачыць за здароўем поласці рота і наведваць стаматолага ў прафілактычных мэтах.

Пры наяўнасці скрыўленай насавой перагародкі, якая замінае нармальнай цыркуляцыі паветра праз нос, рэкамендуецца зрабіць аперацыю па яе выпраўленні. Пры схільнасці да алергій трэба пазбягаць кантакту з алергенам і прымаць апаратыўныя меры для прадухілення алергічнага рыніту, а таксама старацца пазбягаць стрэсаў, якія зніжаюць ахоўныя сілы арганізма.

# КАРДЫЯГРАМЫ МАЛА

### Якія даследаванні могуць выявіць праблемы з сэрцам?



**Інфаркты — галоўная прычына смяротнасці ва ўсім свеце. Аднак большую частку трагедый, настойваюць кардыёлагі, можна было б прадухіліць. І абараніць сябе не вельмі складана.**

Крызіс у рабоце сэрца і сасудаў не адбываецца імгненна і на роўным месцы. Трагедыю заўсёды можна папярэдзіць загадзя, нават калі ішэмічная хвароба сэрца, гэта значыць наліпанне бляшак на артэрыі, як у Юрыя Шатунова, працякала бессімптомна і нічым сябе не выдавала.

Пры гэтым раней лічылася, што ўзрост, калі варта пачынаць актыўна клапаціцца пра сэрца, — 45+. Цяпер узрост інфарктаў і інсультаў вельмі маладзее: інфарктам у 30 гадоў кардыёлагаў не здзівіш. І тут цэлы букет фактараў: і легкадумнае стаўленне да вагі і харчавання, і захапленне электроннымі цыгарэтамі, і ковід, які пагоршыў сітуацыю.

Але па адной кардыяграме паставіць дакладны дыягназ і прадказаць рызыкі на будучыню нельга. Каб убачыць поўную карціну, урач прызначае дадатковае абследаванне. У першую чаргу неабходна здаць кроў: агульны аналіз, аналіз на ўзровень глюкозы, трамбацытаў і на асаблівыя маркеры, з'яўленне ў крыві якіх беспамылкова паказвае праблему.

Каб ацаніць стан сэрца, урачы даследуюць кроў на тры асноўныя паказчыкі. Першы — на ўзровень халестэрыну — асаблівага будаўнічага тлушчу для клеткавых мембран. Частку яго арганізм сам выпрацоўвае, а частка паступае з ежай. Развозам халестэрыну займаюцца адмысловыя бялкі ў крыві. Іх тандэм з тлушчам утварае рэчыва ліпапратэінаў. Ад печані да клетак халестэрын дастаўляюць ліпапратэіны нізкай шчыльнасці, а на зваротным шляху халестэрын падсаджваецца да ліпапратэінаў высокай шчыльнасці. Першыя траўміруюць сасуды. Другія абараняюць іх. І калі другіх у крыві менш, значыць, ёсць рызыка ўтварэння бляшак і развіцця ішэмічнай хваробы сэрца.

Другі важны паказчык крыві — гамацыстэін. Калі яго ў крыві шмат, значыць, у наяўнасці збой, бо ў здаровым арганізме гэтая амінакіслата павінна перапрацоўвацца. А калі, напрыклад, з-за дэфіцыту вітамінаў ($B_6$, $B_{12}$, фоліевая кіслата) яна запасіцца, то, падарожнічаючы па сасудах, пачынае іх разбураць.

Трэці паказчык — трапанін І — бялок сардэчнай мышцы. У крыві яго быць не павінна, а трапіць у яе ён можа, толькі калі пашкоджаныя сардэчныя мышцы. У іншых яго няма. І калі раней гэты трапанін І у крыві можна было выявіць, толькі калі паказчыкі пачыналі зашкальваць, то зараз, тлумачаць эксперты, методыкі і абсталяванне дазваляюць зафіксаваць пашкоджанне сардэчных клетак, калі пацыента яшчэ зусім нічога не турбуе. Праўда, тэхналогія гэтая пакуль не ўсім лабараторыям даступная. Падобны тэст робіць, але ён менш адчувальны. Таму ў дзяржаўных паліклініках на такі аналіз накіроўваюць толькі пацыентаў са станам на мяжы інфаркту.

Адны людзі схільныя да хвароб сэрца мацней за іншых. Кардыёлагі заўсёды распытваюць пацыентаў аб хваробах сваякоў. Аднак на аснове анкеты зрабіць высновы складана. А яшчэ не факт, што ўвесь букет дыягназаў перайшоў дзецям і ўнукам. Даведацца пра тую спадчынную праўду сёння нескладана. Генетычнае тэсціраванне на схільнасць да сардэчных рызык — больш не фантастыка, а руціна. Тэст актуальны ў любым узросце, а яго даныя дапамагаюць скарэкціраваць харчаванне, абмежаваць ці нарасціць фізічныя нагрузкі, падабраць лекі.

**СТУДЗЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛЮТЫ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | | | | | |

**САКАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**КРАСАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

**МАЙ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

**ЧЭРВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

**ЛІПЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**ЖНІВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

**ВЕРАСЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**КАСТРЫЧНІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛІСТАПАД**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**СНЕЖАНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |




Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА.

# НАВАГОДНІ СУСВЕТ ЛАРЫСЫ ЖУРАВОВІЧ

## Знакамітая беларуская мастачка пра калекцыю рарытэтных навагодніх цацак, свята ёлкі і дзіцячыя летуценні

**Мы сядзім у майстэрні мастачкі, а вакол нас — сапраўднае царства навагодніх цацак. Шышкі, Дзяды Маразы, шкляныя пацеркі — няма нічога падобнага на аднатыпныя шары з яловай галінкай і банцікам, якімі сёння любяць упрыгожваць штучныя ёлкі. У дзяцінстве Ларысы штучных ёлак не было, бацька прывозіў з лесу вялікую пад столь елку, і падарожжа ў навагоднюю казку пачыналася...**



**«Масавая амерыканская культура ўрываецца ў наша жыццё і ўсё забівае, — перажывае яна. — Хутка мы зусім забудземся і пра нашы цацкі, і пра песні, і пра традыцыі. Надзеў чырвоную шапачку, узяў бутэльку шампанскага — і ўся нагода».**

Свой першы свядомы Новы год Ларыса адзначала ў 1969-м, калі ёй было чатыры гадкі.

— Маці зрабіла мне карону і пашыла сукенку з марлі, — дэманструе яна фота тых гадоў. — Марлю крухмалілі, каб яна трымала форму. А карону майстравалі з кардону, ваты і абцягвалі таксама марляй. Зверху яна ўпрыгожвалася пацеркамі.

Ёсць у мастачкі невялічкая скрыня з самымі запаветнымі ёлачнымі цацкамі, якія суправаджалі яе ў дзяцінстве.

— Я дакладна ведаю, што іх купілі напярэдадні 1963 года, калі маёй сястры Але было ўсяго 1,5 гадзіка, — удакладняе яна. — Бацькі тады жылі ў маленькай вёсачцы Сакалоўка каля Галоўчына, адтуль яны на грузавым таксі паехалі ў Магілёў і купілі там ёлачныя цацкі.

З каробкі адзін за адным вымаюцца цацачныя дзяўчынка на металічнай прышчэпцы, голуб, сава, шышкі...

— Наогул, гэтых цацак дзяцінства была вялікая скрыня, але яны вельмі крохкія, асабліва шары, — кажа суразмоўніца. — Летам гэта навагодняя казка стаяла пад ложкам. Пра яе мы нават не ўспаміналі — шмат іншых было забаў. А перад Новым годам зноў вярталіся ў казачную атмасферу.









Ларыса дастае бліскучага кракадзіла з тонкага пластыку. Такіх, усміхаецца, тата купіў з запасам. Яны якраз уваходзілі ў моду.

А вунь з тым маленькім ліхтарыкам наогул звязана цёплая навагодняя гісторыя. Яго ў трэцім класе падарыла сяброўка Оля, з якой хадзілі разам у школу.

— Яна жыла з бабуляй у маленькім доміку, — усміхаецца сваім успамінам Ларыса. — У іх нават ёлка была маленькая з малюсенькімі цацкамі. Яна зняла гэтую цацку з ёлкі і падарыла мне. Гэта вельмі ўразіла.

Самая вялікая ёлачная цацка — шкляны цяжкі шар, які нават не вешалі на ёлку, а клалі на падлогу побач з Дзедам Марозам, — на жаль, не захавалася.

— Гэты шар маме падарыла яе знаёмая Люба, — удакладняе суразмоўніца. — Ён быў аграмадны з вельмі тоўстага шкла, яго было цяжка трымаць адной рукой. Больш я такіх нідзе не бачыла. У нас потым было шмат розных шароў, але настолькі тонкіх і крохкіх, што яны часта біліся і прыходзілася купляць новыя. Той вялікі шар захоўваўся вельмі доўга, потым кудысьці знік.

Маленькай Ларысе ў дзяцінстве здавалася, што Новы год — гэта свята ёлкі. Маўляў, вось яна, прыгожая, прыязджае з лесу ў дом да людзей, яе прымаюць як дарагога госця, упрыгожваюць, захапляюцца. Ад яе яловага паху нават галава кружылася.

— Я верыла, што ўсе гэтыя казачныя істоты, якімі мы ўпрыгожваем ёлку, дзесьці ў іншай рэальнасці існуюць, — дзеліцца мастачка. — І Новы год — магчымасць далучыцца да гэтага жыцця. Як ні дзіўна, але жадання ўбачыць Дзеда Мароза не было. Я ведала, што ён абавязкова схаваецца ад мяне. Для людзей гэты казачны свет закрыты. Проста ў пэўны час ён да нас прыбліжаецца. Мне падабалася адкрыць ноччу дзверы ў пакой, дзе стаіць ёлка, і назіраць, як мігцяць на ёй таямнічым святлом навагоднія цацкі і ціха падаюць на падлогу іголачкі.

Дарэчы, ёлку ўпрыгожвалі выключна дзеці — Ларыса і яе сястра Ала. Бацькоўскія абавязкі зводзіліся да дастаўкі зялёнай прыгажуні з лесу і замацавання яе ў спецыяльным вядры з пяском. Часцей за ўсё сёстры прыбіралі ёлку 31 снежня. Яна стаяла ў зале па цэнтры. Недахоп цацак замяняла вата, яе наогул шмат ішло на ёлку. Дзяўчынкі нанізвалі яе на ніткі і развешвалі па ўсім пакоі. На вокны клеілі сняжынкі з паперы. Зала нагадвала зімовы лес, дзе няспынна ідзе снегапад.

Упрыгожвалі ёлку і цукеркамі, якія прыносілі з работы бацькі. А бабуля, якая перажыла вайну і наогул не бачыла навагодніх цацак, загортвала ў фольгу ад цукерак кавалачкі хлебнага мякішу, прывязвала нітачкі і вешала на ёлку. Гэта былі самыя простыя цацкі, але зробленыя з любоўю. Нягледзячы на распаўсюджанае меркаванне, што савецкія дзеці верылі ў Дзеда Мароза, Ларыса Журавовіч і яе сястра ведалі, што цукеркі праз бацькоў ім перадае не казачны дзед, а прафсаюз. Іх у каробачцы было няшмат, і вельмі хацелася расцягнуць задавальненне. У якасці ёлачных упрыгажэнняў яны захоўваліся нядоўга. Хутка пасля Новага года зніклі шакаладныя цукеркі, услед за імі — карамелькі.

Сёння Дзеду Марозу якіх толькі заказаў не робяць: і айфоны, і планшэты.

— У савецкіх дзяцей такіх запытаў і блізка не было, — усміхаецца Ларыса. — Нам дастаткова было свята. А жаданні, калі пастаралася, самі выконваліся. Хацелася аднаго: каб блізкія былі здаровыя і шчаслівыя. Пра матэрыяльнае нават не марылі. Ведалі, якія ў бацькоў зарплаты і што на іх асабліва нічога не купіш. Цукеркі з мандарынамі былі самай вялікай радасцю. Мандарыны наогул здараліся вельмі рэдка. Памятаю, як аднойчы тата прывёз нам гэтую смакату, і мы з сястрой цэлы Новы год толькі іх і елі. Бо казалі: як сустрэнеш Новы год, такі ён і будзе. Жадалі ўвесь год есці мандарыны.

За навагодні стол сям'я садзілася а дзясятай гадзіне вечара. Праводзілі стары год, частаваліся навагоднімі стравамі, якія рабіла маці разам з бабуляй, слухалі бой курантаў. Сёстры, калі падраслі, бегалі на ёлку да райвыканкама, каталіся з сябрамі з горкі. Новы год — гэта ж яшчэ і канікулы. А Ларыса з чацвёртага класа жыла ў Мінску, вучылася на мастачку ў рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. Ахрэмчыка.

— Бацькі шмат працавалі і марылі пра больш лёгкі, як ім падавалася, лёс для дзяцей, — усміхаецца яна. — Я вучылася на мастака, сястра — на музыканта. З дзяцінства нядрэнна малявала, і настаўніца параіла развіваць здольнасці. Калі да нас у школу прыехала камісія з мінскай установы, каб адабраць найбольш таленавітых дзяцей, я трапіла ў лік шчаслівчыкаў. У школе-інтэрнаце таксама адзначалі Новы год, але гэта было напярэдадні свята. А яго мы адзначалі выключна з сям'ёй.

Запомнілася, што ў больш дарослым узросце сямейнікі сталі абменьвацца невялікімі падарункамі. Ларыса рабіла каробку з кардону, упрыгожвала яе зорачкамі з фольгі, клала туды падарунак і дарыла бацькам. Яны радаваліся як малыя.

Першы час ужо ў сваім вялікім доме Ларыса з мужам Вячаславам заўсёды ставілі высокую ёлку і прыбіралі яе рарытэтнымі цацкамі. Прычым выключна савецкімі. Яны знаходзілі іх на блышыных рынках, у камісіёнках, на «Куфары» — інтэрнэт-пляцоўцы прыватных аб'яў. І Ларыса рабіла шмат адкрыццяў. Як мала ведала яна пра гэтыя цацкі ў дзяцінстве! Напрыклад, вось пра тыя незразумелыя формы з пацерак.

— Шкляныя пацеркі — гэта класіка, яны былі ў доме любой савецкай сям'і, — кажа яна. — Але для мяне стала адкрыццём, што з іх можна зрабіць так шмат незвычайных канструкцый. Глядзіце, якія прыгожыя, амаль касмічныя, формы атрымліваюцца. Днямі не стрымалася, купіла яшчэ адну фігурку з серыі. На жаль, купля савецкіх цацак становіцца ўжо даволі дарагім задавальненнем. Калі цацка каштуе больш чым тры рублі, я не спяшаюся яе набываць. Так што не столькі калекцыяніраю, колькі зрэдку сябе радую.

Пра мінулае нагадваюць шкляны піянерскі горн, круцёлка, нават касмічны спадарожнік. Асобны цыкл — садавіна-гародніна. У калекцыі ёсць грэцкі арэх, стручок гароху, морква ў шкле. З апошняга Ларыса набыла сімпатычны мухамор і вялікую па памерах сунічку.

— Паступова сабралася калекцыя домікаў, снегавікоў, малышоў на санках, — знаёміць яна са сваім скарбам. — Некаторыя цацкі — сапраўдныя творы мастацтва. Як вось гэты заварнік з вельмі тонкім носікам і маляўнічым роспісам на баку. Або вось гэты казачны дзед з невадам. Паглядзіце, якая ювелірная рэч, як выразна намаляваны вочы і іншыя дробныя дэталі.

Ларыса вельмі перажывае, што мы хутка забыліся пра свае навагоднія сімвалы. Змянілі добрага дзядулю ў доўгім кажуху на Санту Клауса. І пра песні свае забыліся. Мурлыкаем пад нос шараговае Jingle Bells замест «У лесе нарадзілася елачка».

— Масавая амерыканская культура ўрываецца ў наша жыццё і ўсё забівае, — перажывае яна. — Хутка мы зусім забудземся і пра нашы цацкі, і пра песні, і пра традыцыі. Надзеў чырвоную шапачку, узяў бутэльку шампанскага — і ўся нагода. Страчваецца таямніца, пераемнасць, усе святы становяцца падобныя адно на адно. Вы звярнулі ўвагу, што сёння на вуліцы амаль няма снегавікоў? У маім дзяцінстве іх рабілі ў кожным двары — сапраўдных, з морквай замест носа, старымі вёдрамі на галаве, мётламі. А яшчэ мы будавалі снежныя крэпасці. Весела было. Для мяне Новы год — па-ранейшаму ўнікальная магчымасць акунуцца ў іншую рэальнасць, нешта ўспомніць. І, як у дзяцінстве, дастаць старую каробку з навагоднімі цацкамі, адкрыць яе і паглыбіцца ў сузіранне. Адчуванне Новага года мацнейшае, чым само свята.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*г. Бялынічы.*

Антон КРАЎЧАНКА:

# «БЫЦЬ ПРЫНЦАМ СУМНАВАТА»

**Калі не ён прынц, дык хто ж тады? І я цяпер маю на ўвазе не вобразы з балетаў, у якіх можна бачыць гэтага артыста. Сэнс, які жаночая палова чалавецтва ўкладае ў паняцце «прынц», у дадзеным выпадку падмацоўваецца яшчэ і беларускім менталітэтам, калі ўсе казкі можна ствараць самім. Прычым і ў жыцці, і на сцэне. І з беларускім хэпі-эндам: узнагародай за працавітасць. У прамінулым годзе званне народнага артыста Беларусі прысвоена Антону Краўчанку, артысту балета. Тое, што элітны від мастацтва папаўняе шэрагі народных, самога артыста не здзіўляе, таму што ён кожны дзень адчувае ўвагу прыхільнікаў балета, якіх у нас нямала, а ёсць наогул тыя, хто ходзіць у Вялікі тэатр «на Краўчанку» і разумее, колькі працы стаіць за яго высокім званнем:**



Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

— Яно даецца па факце таго, што ўжо зроблена, — адзначае Антон. — Наша прафесія своеасаблівая, якая патрабуе вялікіх фізічных сіл і працавітасці, бо не проста так раней яе прадстаўнікі рана сыходзілі на пенсію. З гадамі сыходзяць сілы, здароўе, страчваецца форма, якая дае магчымасць працаваць. Гэта як спорт: трэба ўвесь час даказваць, што ты здольны выходзіць на сцэну і паказваць вынік. Я б сказаў, што прызнанне да мяне прыйшло даўно, а званне — нашмат пазней. Безумоўна, гэта вельмі прыемна: я ўсё жыццё аддаў балету і гэтаму тэатру.

***— Толькі адзін тэатр у кар'еры — як вам тое ўдалося?***

— Былі прапановы, але заўсёды ёсць момант выбару. Хтосьці з'язджае, выбірае грошы і выдатна сябе адчувае. Але кожны сам нясе адказнасць за свой выбар.

***— Ваш выбар быў абумоўлены патрабаванасцю?***

— Хутчэй, так распарадзіўся лёс. Я нават не думаў, што прыйду ў гэты від дзейнасці. Сядзеў у школе за партай, да нас прыйшлі нейкія людзі, мяне некуды адабралі, сказалі, калі і куды з'явіцца. Я прыйшоў, мяне зноў адабралі. Пасля я вучыўся, вучыўся, вучыўся і трапіў у наш тэатр — зноў адабралі. Чарада падзей, якія бываюць у жыцці кожнага чалавека.

***— Але далёка не кожны хлопчык, якога адабралі ў балет, прыйдзе і застанецца.***

— Я прыходзіў у іншай краіне, якая «ў галіне балета была наперадзе планеты ўсёй». І тады балетная кар'ера давала шмат плюсоў. Адразу пасля заканчэння школы ў цябе была прафесія. Яна дазваляла выязджаць за мяжу, рана выходзіць на пенсію. Потым часы змяніліся, і цяпер нашмат больш выгадна аддаць свайго хлопчыка ў хакей, напрыклад — там яшчэ больш плюсоў. Вось і ўзніклі праблемы з камплектаваннем балетных труп мужчынамі не толькі ў нас, але і ў Расійскай Федэрацыі. Праца цяжкая, каласальныя нагрузкі, супастаўныя з нагрузкамі шахцёраў. Але калі дзіцем паступаеш у балет, пра гэта не задумваешся, як і пра тое, што трэба будзе кожны дзень хадзіць у залу і гадзінамі займацца. Мая мама ў маладосці прафесійна займалася плаваннем, і заўсёды казала мне, што ў яе было па тры трэніроўкі на дзень: раніцай, днём і ўвечары. Гэтаксама і ў нас.

А потым, у свядомым узросце, больш задумваешся пра тое, як танцуеш, чым пра тое, што гэта работа, спалучаная з цяжкасцю. Ты ж не проста так прыйшоў — узяў вагу ці не ўзяў, як гэта бывае ў штангістаў, а ствараеш вобраз, нараджаеш танец, любоў.

***— Ці бывала такое, калі вы бачылі ў нейкім героі сябе?***

— Любы артыст прапускае ролю праз сябе. Таму адзін і той жа спектакль з рознымі выканаўцамі можа ўспрымацца па-рознаму. Напрыклад, я танцую Спартака так, як я яго бачу. Гэта маё ўспрыманне свету і чалавечага жыцця. Мусіць, добра, калі глядач можа ўбачыць розныя ўвасабленні. Але прафесіяналізм артыста яшчэ і ў тым, каб не капіраваць сябе ва ўсіх вобразах, калі і Рамэа, і Спартак ці Атэла могуць атрымлівацца аднолькавымі. Майстэрства ў тым, каб умець паказаць і злога, і закаханага, і мужнага чалавека. Каб былі розныя фарбы, трэба шукаць у кожным персанажы характэрныя менавіта для яго рысы. Калі я рыхтуюся да ролі, то разважаю: а як ён думаў, чым ён жыў? Якія тады былі часы? Што паўплывала на яго характар?

***— Вам больш блізкія героі ці прынцы?***

— Не, не прынцы. На мой погляд, быць прынцам сумнавата: паказваць, які ён далікатны і ранімы, як усё трагічна ў яго лёсе. Для мяне гэта адна фарба. А калі выконваеш Спартака ці князя Уладзіміра, то менш рамак, у якіх ты знаходзішся, таму персанаж атрымліваецца больш цікавым, нягледзячы на тое, што харэаграфія зададзена. Але нават калі трэба толькі правесці рукой, важна, як ты гэта робіш. Як дакрануўся да партнёркі? Якая пры гэтым будзе пастава твайго корпуса? Як ты на яе паглядзіш? Вось гэта артыст шукае сам. Альбо ты любіш, альбо ненавідзіш, альбо ўвасабляеш злыдня, альбо рамантычнага героя. Наш інструмент — цела, з яго дапамогай мы маем зносіны з гледачом і, змяняючы паставу корпуса, рук, ног, мяняем і характар свайго героя.

***— Ці ёсць у вас перавагі па харэаграфіі? У тэатры ж розныя спектаклі — ад класікі да сучасных балетаў Елізар'ева.***

— Сучасны танец у чыстым выглядзе — не зусім мая гісторыя, больш блізкае нешта сярэдняе паміж ім і класікай. Мне падабаецца рэпертуар нашага тэатра. Гэта адна з прычын, чаму я тут. Танцоўшчык жа выбірае не толькі зарплату, але і патэнцыял для раскрыцця. Як можна працаваць, няхай нават за вялікія грошы, але рабіць тое, што табе не падабаецца? Я станцаваў усе спектаклі Елізар'ева, нават тыя, якія цяпер не ідуць, можна сказаць, на іх вырас, памужнеў і пераўтварыўся ў сапраўднага артыста. Мне падабаецца, што ў іх ёсць звышзадача, як і ў спектаклях Траяна і некаторых іншых балетмайстраў, якія тут ставілі. Напрыклад, цудоўны балет «Ганна Карэніна» Вольгі Костэль. Трэба думаць, як раскрыць той ці іншы вобраз, каб глядач насіў яго з сабой і нейкі час працягваў разумова мець зносіны з героем. Калі я трапляю на добры спектакль у драматычным тэатры, я яшчэ некалькі дзён пракручваю ў свядомасці тое, што ўбачыў. Мне падаецца, што ёсць балетныя спектаклі, якія глядач таксама працягвае аналізаваць, калі ўжо знаходзіцца дома.

***— А што больш цяжка танцаваць фізічна?***

— Вядома, спектаклі з драматычным сюжэтам. Заўсёды лягчэй танцаваць без эмоцый і без глыбокіх вобразаў. Проста прыходзіць і адпрацоўваць неабходныя рухі. Напрыклад, прайсці «Спартак» без эмоцый у некалькі разоў лягчэй, чым з эмоцыямі. Я ў гэты спектакль уводзіў Дзяніса Шпака. Кажу яму: вось зараз будзе вельмі цяжка. Калі пасля першага акта я падышоў да сцэны, ён з цяжкасцю прашаптаў: «Я разумеў, аб чым вы папярэджвалі, але не думаў, што будзе настолькі цяжка». Калі ствараеш вобраз і робіш рухі ад сэрца, ад душы, жывеш сваім персанажам, аддаеш сябе цалкам, то сіл сыходзіць у разы больш. Але і гледачы гэта бачаць, адчуваюць і цэняць.

***— Ці ўплывае на поспех ролі партнёрства? Ці ўлічваюцца пажаданні артыстаў, з кім танцаваць?***

— Безумоўна! Добры партнёр (партнёрка) — залог поспеху. Бо разам любую справу рабіць лягчэй. Мне больш падабаецца танцаваць у пары, чым аднаму. І ніколі я не адмаўляўся і не выбіраў партнёрак. Лічу, што з рознымі партнёрамі можна раскрыць больш якасцяў у адным і тым жа персанажы. Ну і зноў жа — гэта праца. Ці мала якія ў жыцці адносіны з чалавекам, але ты павінен выйсці на сцэну і танцаваць так, як бачыцца вы любіце адно аднаго больш за жыццё.

***— А як вы змаглі падзяліць работу і дом?***

— Так, мы не працуем разам з жонкай. Яна таксама ў мастацтве — артыстка балета ў цырку. У нас па хвілінах разлічана, з кім і калі знаходзяцца дзеці, хто адводзіць, хто забірае. Хацелася б больш часу аддаваць ім. Мне падабаецца сядзець з дзецьмі, не раздражняе плач ці гучныя гульні. Шчыра кажучы, калі б узровень заробку быў вышэйшы ў жонкі, я мог бы нават аформіць дэкрэт, тым больш што заканадаўства гэта дазваляе. У мяне тут няма прадузятасці. У нас, на жаль, усяго адзін выхадны на тыдзень. Няма такога, каб можна было колькі заўгодна часу прысвяціць сям'і. Па вечарах кожны дзень спектакль, а раніцай трэба ўставаць, бо дзяцей везці ў школу, у садок. Увечары, як гэта часта бывае ў тэатральных сем'ях, дзеці ў тэатры ці ў цырку глядзяць, як бацькі працуюць.



***— А былі моманты, калі на нейкі час выбывалі са строю і гаварылі сабе: нарэшце ёсць магчымасць адпачыць?***

— Так, калі ідзеш на бальнічны. З аднаго боку табе кепска, ты хварэеш, а з другога — думаеш, можа, і добра што захварэў, хоць адпачну. У нас ва ўсіх ёсць свае прафесійныя захворванні. Часцей за ўсё — ад перагрузак. Нехта можа спыніцца, адпачыць і зберагчы сябе ад сур'ёзных траўмаў, а нехта спрабуе перажыць, перацярпець. У многіх такое бывае менавіта ў пачатку шляху, калі партыі сыплюцца як з рога дастатку. Рыхтуеш адну за другой, пры гэтым ужо ідуць спектаклі з тваім удзелам, а паралельна рэпецірууеш прэм'еру.

***— А пабергачы сябе, танцаваць не на поўную моц?***

— Я ўсё спрабую навучыцца гэтаму. Ужо нібыта па ўзросце можна. Нават і па званні — усё зразумеюць. А вось не магу: трэба выкласціся, калі ўжо выйшаў на сцэну, бо глядач невінаваты, што табе цяжка і, бо глядач невінаваты, што табе цяжка і, бо кажуць, далёка не 18. Вось так 20 гадоў і праляцелі, як адно імгненне.

***— Што для вас найлепшы адпачынак?***

— Жонка кажа, што я не ўмею адпачываць. Няма такога, каб на рыбалку з'ездзіць ці яшчэ неяк адцягнуцца — заўсёды знаходжу сабе занятак. У артыстаў балета так мала выхадных у прынцыпе, што гэты адзіны дзень расплянаваны з раніцы да вечара. А калі ён заканчваецца, аказваецца, што на палову спраў не хапіла часу.

***— Пры гэтым вы нават дом здолелі пабудаваць сваімі рукамі.***

— Калі б я мог сабе дазволіць наняць людзей, якія б гэта зрабілі, вядома, не займаўся б сам. Але мне было нескладана і часам, па маладосці, нават цікава. Плюс фінансавыя выдаткі былі расцягнутыя на гады, таму што будаваў у растэрміноўку, і я быў на 100% упэўнены ў якасці, паколькі ўсё рабіў сам і для сябе, памятаў, што аматар пабудаваў каўчэг, а прафесіяналы — «Тытанік».

***— Вы атрымалі вышэйшую адукацыю ў галіне эканомікі, хоць лагічна было б атрымаць дыплом у сферы культуры...***

— Навошта вучыцца таму, што я і так ведаю? Напрыклад, у нас ёсць спецыяльнасць «педагог рэпетытар». Але я ж яе і так разумею, ужо 10 гадоў гэтым займаюся. А марнаваць час дзеля дакумента сэнсу не бачу. Прытым мне заўсёды падабалася матэматыка. Цікавілі асновы эканомікі і прадметы, якія выкладалі ў Акадэміі кіравання. Нават паліталогія.

***— Эканоміка — гэта, у прынцыпе, «бытавуха». А тэатр заўсёды недзе над ёй.***

— Тэатр не існуе па-за жыццём, ён заўсёды пра яго. Мне цікава, як усё ў ім узаемадзейнічае. Я ўвогуле лічу, што эканоміку трэба выкладаць у школе. Кожны чалавек павінен ведаць асновы функцыянавання дзяржавы. Што перад ім заўсёды стаіць выбар, што вырабляць зараз — масла ці гарматы? І тады людзі будуць разумець, чаму адбываецца менавіта так, а не інакш.

Потым я вырашыў, што мне мала, і пайшоў вучыцца на міжнародныя адносіны і ў магістратуру — яшчэ больш паглыбіўся ў філасофію і паліталогію. Мне ўсё гэта было вельмі цікава яшчэ і дзякуючы цудоўным выкладчыкам у акадэміі. Пры гэтым танцаваў увечары спектаклі. Атрымлівалася ўсё паспяваць, кіраўніцтва ішло насустрач з больш зручным графікам.

***— Што ж не бераглі сябе? Няўжо занадта высокая нагрузка не спалучана з пагрозамі траўматызму? І ці ёсць у артыстаў балета свая «тэхніка бяспекі»?***

— Пакуль што мне шанцавала: не было занадта сур'ёзных траўмаў. Небяспечна, калі здараюцца парывы звязак, нават пераломы не такія страшныя: месяц у гіпсе — і парадак. А са звязкамі будзеш пакутаваць усё астатняе жыццё.

***— Жыццё ў балеце — суцэльны шлях пераадоленняў. Гэта ў вас у характары, ці спецыяльна трэніруецеся?***

— Кожны дзень, пачынаючы з пятага класа каледжа, пражываеш, пераступаючы праз сябе. І гэта працягваецца, пакуль ты не скончыш танцаваць. Прачынацца раніцай, прыходзіць на ўрок класічнага танца. Падлічыў, што, займаючыся адным толькі ўрокам класічнага танца штодзень, я аддаў цэлы год жыцця. А гэта патрэбна для таго, каб трымаць сябе ў форме.

Штодзённае пераступанне праз сябе, мабыць, адно з самых складаных, што ёсць у нашай прафесіі. Калі наперад ведаеш, як табе будзе цяжка, як ты будзеш паміраць на сцэне, вобразна гаворачы. Але ты ўсё роўна ідзеш і танцуеш, выкладваешся цалкам. І ўсё думаеш, як зрабіць лепш, як вышэй скокнуць, як ускладніць. Бо калі я магу і пакуль магу, то трэба зрабіць максімальна добра, максімальна складана, максімальна эфектна.

***— Ці ёсць нейкая роля, якую вы б яшчэ вельмі хацелі станцаваць?***

— У нашым тэатры я станцаваў практычна ўсё. Ніколі не прасіў ролю.

Ролі, якія мне падабаліся, я танцаваў усе. Знакавыя — Спартак, князь Уладзімір, Вітаўт, Хазэ, Адам, Зігфрыд, Шчаўкунок, Альберт, Вронскі.

***— Частку сваіх роляў вы перадаяце маладым артыстам. Як гэты момант даецца эмацыянальна?***

— Я ж не буду танцаваць вечна... Разумею, што прыйдзе дзень, калі трэба будзе пайсці са сцэны. І трэба думаць пра гэта загадзя, перадаваць досвед маладым артыстам. Мне здаецца, што ім цікава. Як мне ў свой час было цікава працаваць з Юрыем Траянам, які быў бліскучым артыстам. Ён паказваў і расказваў, як лепш зрабіць, як працаваць над вобразам. Я ў яго шмат чаму навучыўся і не дабіўся б такіх поспехаў без яго падтрымкі. Заўсёды так адбываецца, але хтосьці павінен заставацца і танцаваць рэпертуар.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 628 | 23,40 | 2,34 | 1,17 |
| 2 | Огнетушитель ОУ-80, инв. № 707 | 34,80 | 3,48 | 1,74 |
| 3 | Огнетушитель ОУ-80, инв. № 708 | 34,80 | 3,48 | 1,74 |
| 4 | Мерник образ. М2Р-50, инв. № 1026 | 25,20 | 2,52 | 1,26 |
| 5 | Компрессор У-43102А, инв. № 6071 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 6 | Шкаф металлический 28 шт, инв. № 924-951 | 336,00 | 33,60 | 16,80 |
| 7 | Стол для руководителя, инв. № 7007 | 16,20 | 1,62 | 0,81 |
| 8 | Автомобиль ГАЗ-2705, АР 6310-5, г. в. 1999 | 432,00 | 43,20 | 21,60 |
| 9 | Автомобиль «Фольксваген Шаран», 1244 ВН-5, г. в. 1995 | 1260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 10 | Капитальное строение с инв. номером 630/С-49330 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание, общая площадь – 1 944,2 кв. м) | 233520,00 | 23352,00 | 11676,00 |
| 11 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АІ 7405-5, 2010 г. в, инв. № 12777 | 12204,00 | 1220,40 | 610,20 |
| 12 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АІ 7407-5, 2010 г. в, инв. № 12751 | 12204,00 | 1220,40 | 610,20 |
| 13 | Горизонтально-фрезерный станок 6082, инв. № 759 | 1782,00 | 178,20 | 89,10 |
| 14 | Станок ЗК-633, инв. № 1040 | 334,80 | 33,48 | 16,74 |
| 15 | Станок Р-105, инв. № 734 | 415,80 | 41,58 | 20,79 |
| 16 | Станок ЦКБ-Р335, инв. № 724 | 302,40 | 30,24 | 15,12 |
| 17 | Станция 0160-2, инв. № 1041 | 388,80 | 38,88 | 19,44 |
| 18 | Установка ЦКБ-Р-114, инв. № 719 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 19 | Пресс-ножницы, инв. № 756 | 1836,00 | 183,60 | 91,80 |
| 20 | Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 727 | 91,80 | 9,18 | 4,59 |
| 21 | Сварочный агрегат, инв. № 1082 | 156,60 | 15,66 | 7,83 |
| 22 | Сварочный агрегат, инв. № 1082а | 156,60 | 15,66 | 7,83 |
| 23 | Сварочный агрегат, инв. № 1082б | 156,60 | 15,66 | 7,83 |

В отношении лотов №№ 1–7 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 95 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15, № 229 (29851) от 22.11.2022, стр. 10, № 245 (29867) от 14.12.2022, стр. 14. В отношении лотов №№ 8–10 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 85 % в отношении лотов №№ 8, 9. Стоимость снижена на 80 % в отношении лота № 10.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 4, № 165 (29787) от 24.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15, № 229 (29851) от 22.11.2022, стр. 10, № 245 (29867) от 14.12.2022, стр. 14. В отношении лотов №№ 11–23 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 55 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 165 (29787) от 24.08.2022, стр. 14, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15, № 229 (29851) от 22.11.2022, стр. 10, № 245 (29867) от 14.12.2022, стр. 14.

Местонахождение лотов №№ 1–23: Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2.
Лот № 10 расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030, площадью 4,4255 га, для обслуживания и эксплуатации производственной базы. Право аренды Продавца (83/100 доли)

| | |
|---|---|
| **Ограничения (обременения)** | В отношении лота № 10 имеются обременения в виде заключенных договоров аренды. **По вопросу обременений обращаться по тел. +375293489225.** |
| **Дата и время проведения торгов** | **17 января 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 4 января 2023 года до 16.00 13 января 2023 года |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000,** код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Автотрансстрой», проводимых 17.01.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста по Лотам №№ 1–9, 11–23 – 7 %, по Лоту № 10 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Александр Николаевич, тел. +375292627504. Дополнительная информация по лоту № 19 по тел.: +375293042560, +375293082762.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | ОАО «Автотрансстрой» в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182) |
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: **info.torgi@orgtorg.by** • сайт: **https://orgtorg.by** • telegram: **https://t.me/orgtorg** |

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона

**Предмет торгов – лот:** капитальное строение с инвентарным номером 622/С-45640 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 74,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Калиновского, 7, на земельном участке с кадастровым номером 625450100001004459, площадью 0,0568 га (выделен на праве аренды, срок по 16.06.2063).Составные части и принадлежности: сборно-щитовой облицованный кирпичом жилой дом А1/сщ, с дощатой верандой (1), кирпичным сараем (2), бетонным погребом (2)

| **Начальная цена, руб.** | 3 780,00 | **Размер задатка, руб.** | 378,00 | **Шаг, руб.** | 189,00 |
|---|---|---|---|---|---|

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни, предварительно согласовав время по тел. 8029 569 19 72. **Продавец:** ОАО «Столбцовский РКБО», т/ф 8029 569 19 72. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 801620408701. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк», ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. Задаток перечисляется на расчетный счет организатора аукциона. **Срок подписания договора купли-продажи:** не позднее 15 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно подписанному договору купли-продажи в течние 30 дней с даты подписания договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Обременение:** в выставляемом на торги объекте зарегистрированы и проживают граждане, в т. ч. несовершеннолетние. В случае если торги признаны несостоявшимися в свзяи с тем, что заявление на участие в них подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Ранее извещение о проведении повторного аукциона размещено в газете «Звязда» от 06.12.2022.

**Аукцион состоится 16 января 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок оформления участия в аукционе, порядок оформления результатов торгов, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 16 января 2023 г. до 10.00.**

**ООО «СпецРеализация» объявляет об отмене** опубликованных в РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 240 (29862) за 07.12.2022, открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ИООО «Туртэсс Трэвел» (УНП 191046008, г. Минск, ул. Евфросиньи Полоцкой, д. 5, оф. 98), назначенных на 10 января 2023 года, начало – 10.00.

УНП 691842036

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже трактора, принадлежащего ОАО «Хотимский льнозавод»

(УНП 700024111, Могилевская обл., г. п. Хотимск, ул. Льнозаводская, 9)

**Аукцион состоится 07.02.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352** (офис Организатора аукциона)

**Лот № 1** – **трактор «Беларус-3022»,** г. в. 2008, зав. № 30200573, инв. № 225, р/з ТА-6 4734. Начальная цена продажи – 31 560,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 3 156,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %. Местонахождение лота – г. п. Хотимск, ул. Льнозаводская, 9 (контактное лицо для осмотра – Михаил Викторович, +375 29 187 45 56).

Р/с для перечисления задатка – BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа – 40901.

Срок подачи документов – до 11.00 06.02.23. Срок подписания договора купли-продажи – 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатка, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by. Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот:** изолированное помещение с инвентарным номером 111/D-5680 (наименование: квартира № 2 в блокированном жилом доме; назначение: квартира), площадью 54,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Коньковский с/с, д. Дарево-Чиж, ул. Лесная, 4-2 | 9 900,00 | 990,00 |

**Продавец:** ОАО «Путь новый», Брестская обл., Ляховчский р-н, аг. Новоселки, ул. Ценральная, 14, тел/факс 8016333 3 17 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел. 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк», ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** до заключения договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 6 февраля 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 3 февраля 2023 г. до 17.00**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 31 января 2023 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе начальная цена не завершенного строительством капитального строения, земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Ларисы Ляшенко, 15 (У-400, микрорайон «Заболоть») 440100000001007988 | 0,0998 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, наружная площадь (площадь застройки) 174 (174) кв. м, степень готовности 8 %. Фундамент: железобетон | 367,30 | 34 092,30 (6 048,50; 28 043,80) | 6 800 |

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «ГАГРЗК» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; в установленный срок продолжить строительство жилого дома. Затраты на организацию и проведение аукциона рассчитываются исходя из фактических затрат и доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись. Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000, Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

**Аукцион состоится 31 января 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов осуществляется по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 9 января по 25 января 2023 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (152) 626055, 626056. http://gcn.by, telegram-канал: https://t.me/grodno_cn.

Усмешачку!

# «Быў дурны я — што палена, Бо сям'і (!) шукаў замену...»

**Мусіць, яшчэ раз: калі б конкурсу «Хто каго?» на старонках «Звязды» не было, яго, далібог, варта было б прыдумаць! Для таго, каб надрукаваць у газеце сотні (?!) такіх нечаканых здымкаў, каб атрымаць ад чытачоў тысячы лістоў з варыянтамі подпісаў, каб ім жа, сваім чытачам, падарыць мільёны ўсмешак, каб з дапамогай газеты ў розных кутках краіны адкрыць мноства талентаў, каб пакінуць у мове цэлы россып перлаў-залацінак...**

**А пачыналася ўсё з таго, што аднойчы, гадоў з 20 (!) таму Звязда» надрукавала першы здымак з просьбай прыдумаць подпіс (не больш за восем радкоў), трохі пазней — аб'явіла конкурс на найлепшы, стварыла журы, стала ўзнагароджваць пераможцаў...**

**Недахоп, як выглядала, заставаўся адзін: здымкі і найбольш удалыя подпісы друкаваліся раней, аўтары найлепшых (у тым ліку прозвішчы пераможцаў) называліся пазней... І толькі ў навагоддзе, як той казаў, «пазлы» сталі сыходзіцца!**

**Такім чынам — чарговы конкурс «Хто каго?», найлепшае: разглядаем здымак — чытаем подпісы — усміхаемся...**

## «ХЛОПЦЫ ЕДУЦЬ НЕ ГУЛЯЦЬ, ЕДУЦЬ ПАШАНЬКУ ПАХАЦЬ...»

*Тут спрадвеку*
*люд меў шанцы*
*Адарваць падэшвы ў танцы:*
*Выдаваў —*
*парой да ранку —*
*Польку, танга, сербіянку,*
*Вальс, гапак ці кракавяк...*
*Ну й прazвалі месца так.*
**Любоў Чыгрынава,**
***г. Мінск.***

*Зноў кіруюць Пеця з Янкам*
*У мястэчка*
*Пагулянка!*
*Бо вясёлыя там дзеўкі,*
*Любяць танцы і прыпеўкі,*
*А пасля бутэлькі піва —*
*Шчэ і мілыя надзіва!*
**Софья Кусянкова,**
***Рагачоўскі раён.***

*Кажуць, сёння ў Пагулянцы*
*Будуць спевы,*
*танцы-шманцы...*
*І пітво ракою там,*
*Закусь — свята жыватам...*
*Калі ж прыйдзе час вяртацца,*
*Трэба, хлопцы, пастарацца —*
*Не пакінуць недзе ровар,*
*Не прыйсці дамоў*
*на бровах.*
**Мікалай Камароўскі,**
***г. Орша.***

*У мястэчку Пагулянка*
*Казіно адкрыў Іванка:*
*Той,*
*хто куш сарваць мяркуе...*
*З самай раніцы шыбуе.*
*Ды азарт — хвароба злая,*
*Слабы з ёй — не выжывае:*




*І тады ўжо —*
*вось дзівосы:*
*Ў гулі — франтам,*
*З гуляў — босы.*
**Валерый Гаўрыш,**
***г. Чавусы.***

*Ў дальняй вёсцы*
*Пагулянка*
*Самагонку цісне Ганка.*
*Першы слоік —*
*паўлітровы —*
*Дэгустуе ўчастковы.*
*(Калі ўстаў не з той нагі,*
*Забірае і другі)...*
*Па астатні — хлопцы едуць:*
*Найчасцей — веласіпедам.*
**Іван Янкаў,**
***г. Мінск.***

## «ЯШЧЭ ПАРУ ГОД НАЗАД БЫЎ У МАР'І ЗААСАД...»

*Шчасце — козачку даіць!*
*Шчасце — з ёй пагаманіць:*
*Пра бяду,*
*як ёсць, раскажаш, —*
*Ад душы, глядзіш, адляжа...*
*Вельмі слаўная каза:*
*Супраць? Не!*
*Заўсёды «за».*
**Таццяна Новік,**
***г. Клецк.***

*Не было раней такога:*
*Вёска —*
*вымерла ці спіць?..*
*Застаецца хоць з казою*
*Цераз плот пагаманіць:*
*— Як жывеш, суседка Аза?*
*— Ды пра што тут*
*гаварыць?*
*Мой казліна спіць, зараза...*
*— Мой гультай*
*таксама спіць.*
**Мікалай Камароўскі,**
***г. Орша.***

*Яшчэ пару год назад*
*Быў у Мар'і заасад (!),*
*Паглядзець таго звяр'я*
*Людзі ехалі здаля.*
*Забяспечвалі прыбытак,*
*Пагашаліся крэдыты...*
*Ад кавіду ўсё гора:*
*Ў «заасадзе» толькі Бора.*
**Любоў Чыгрынава,**
***г. Мінск.***

*Козліка бабця вельмі любіла,*
*Козліка бражкаю*
*часта паіла...*
*Вырас казёл...*
*з казою здружыўся:*



*Хутка мутант*
*у яе нарадзіўся.*
*Да бабкі прыйшоў*
*і глядзіць-дакарае:*
*Ну што ж ты зрабіла,*
*дурніца старая?*

*...Падобнае нешта*
*здараецца й з намі,*
*Як добрую справу*
*ды зробім «па п'яні».*
**Мікалай Старых,**
***г. Гомель.***

## «АБЯЦАЎ ІВАНКА РАІ: «БУДЗЕШ ЖЫЦЬ СА МНОЙ У РАІ!..»

*Як убачыў шыльду Косця,*
*Ажно сэрцайка зайшлося:*
*Пабудую тут даміну,*
*Прывяду ў яе дзяўчыну...*
*Рот, браток, не разявай:*
*Не паедзе краля ў Рай.*
**Любоў Чыгрынава,**
***г. Мінск.***

*Угаворваў Дзіма Фроську:*
*— Пераедзем жыць у вёску!*
*Дзеўка*
*ўсё вагалася —*
*Доўга не згаджалася...*
*А сказаў:*
*— Махнём у рай!*
*Фрося тут жа:*
*— А давай!*
**Валянціна Гудачкова,**
***г. Жыткавічы.***

*Абяцаў Іванка Раі:*
*«Будзеш жыць*
*са мной у раі!..»*
*Што для гэтага зрабіў?*
*Шыльду ля двара прыбіў.*
**Соф'я Кусянкова,**
***Рагачоўскі раён.***

*Са сталіцы ў... адрыну*
*Ясь прывёз сваю Яніну.*
*Цалаваў — аж да світання,*
*Аж да шчырага прызнання:*
*— Больш я ў горад — ні нагой:*
*Застаюся тут, з табой!*
*...Вось такая перамена!*
*Вось што робіць водар сена!*
**Валерый Гаўрыш,**
***г. Чавусы.***

*Хлопец шыльду прыбівае:*
*Вось ён, тут, пачатак Раю!*
*Я, дурны, раней не знаў,*
*Куляй міма пралятаў.*
*Але ж выпісаў «Звязду»*
*І цяпер ужо знайду!*
**Эльяш Банель,**
***г. Мінск.***



## «ЯК НЕ ЎСЕ Ў ХЛОПЦАЎ ДОМА, НЕ ПУЖАЮЦЬ ПЕРАЛОМЫ»

*«Колю можна не карміць —*
*Дай хоць нешта палічыць:*
*Не дакладна,*
*хоць бы груба,*
*Дрэвы, зоркі,*
*грошы, «зубы»...*
*Ён паўсюль падлік вядзе,*
*Можа, й тут не ўпадзе?*
**Іна Алісевіч,**
***Уздзенскі раён.***

*У коле круціцца вавёрка,*
*А на коле — наш Ягорка.*
*Паспрачаўся небарака:*
*Уверх залез...*
*А злезе — ракам?*
**Валянціна Гудачкова,**
***г. Жыткавічы.***

*На пляцоўку,*
*дзе «БелАЗ»,*
*Заявіўся пяты клас*
*І пачуў: усё, што бачыць,*
*Можна мацаць,*
*тузаць, крабаць!..*
*Дзеткі тут жа,*
*як мурашкі,*
*Урассыпную...*
*Згледзець цяжка...*
*Выдаваў хіба што гук...*
*Ледзь сабраў пасля фізрук!*
**Валерый Гаўрыш,**
***г. Чавусы.***

*Вася — знатны бульбавод —*
*Зімкай не лайдачыць:*
*Кожны дзень і кожны год*
*Гной адвозіць тачкай...*
*На «БелАЗе» пабываў —*
*Ходзіць невясёлы:*
*Усё з «панчохі» бы аддаў*
*За такія «колы»!*
**Віктар Сабалеўскі,**
***г. Узда.***

*Трэба, трэба пастарацца*
*І ў кабіну як прабрацца —*
*Руль абняць, націснуць газ...*
*Адказаў яму БелАЗ:*
*— Шмат ахвотнікаў такіх*
*Толькі я — не для дурных.*
**Мікалай Касмачэўскі,**
***г. Наваполацк.***

## «ТРАВУ СКАСІЛІ ТРАКТАРЫ, А ТЫ БЯРЫ... ЦІ НЕ БЯРЫ...»

*Накасіў Ясь канюшыны,*
*Ды бяда —*
*няма Яніны,*
*Каб вазок, як трэба скласці...*
*Няма жонкі —*
*няма шчасця.*
**Сужэнцы Астроўскія,**
***г. Мінск.***

*Усёй Грушаўцы вядома —*
*Працаголік гэты Рома!*
*Гаспадар — на ўсю акругу:*
*І з касою, і за плугамі!*
*Гумарыст, не выпіваха...*
*Чаму ж дзеўкі*
*бокам, бокам?*
*— З ім жа*
*будзеш пеклавацы:*
*Ні паспаць, ні пагуляць...*
**Любоў Чыгрынава,**
***г. Мінск.***

*У суботу грамадой —*
*Дзела маладое —*
*На касьбу ішлі з расой:*
*Сенажаць...*
*Раздолле...*
*Адышліся на спачын —*
*Скралі сена тое...*

*Прапіў бацька,*
*прапіў сын,*
*Прапівалі двое.*
**Віктар Сабалеўскі,**
***г. Узда.***

*...Касіў бацька, касіў я,*
*Мы касілі разам,*
*А прыйшла адна каза —*
*З'ела ўсё адразу.*
**Алена Война,**
***г. Гродна.***

*Быў дурны я —*
*што палена,*
*Бо сям'і (!)*
*шукаў замену:*
*Працаваў,*
*не знаў спачыну,*
*Не для дзетак,*
*а для псінаў...*
*Ці прабачыш тое, Лена?*
*Ці захочаш зноў*
*на сена?*
*Як раней было...*
*Дык вось —*
*Я вязу дадому воз!*
**Мікалай Камароўскі,**
***г. Орша.***






***...Апошні (ці, дакладней, чарговы...) конкурсны здымак быў надрукаваны 9 лістапада. Не дзіва, што многія з чытачоў ужо даслалі свае варыянты подпісаў. Нехта, магчыма, яшчэ дашле. І тым самым далучыцца да кампаніі пастаянных аўтараў, цікавай яшчэ і тым, што ў навагоддзе многія з іх абавязкова дасылаюць віншавальныя паштоўкі (рэдакцыі і адно аднаму), дзякуюць за цікавыя матэрыялы (і за магчымасць самім «паварушыць мазгамі»), за «адзіна вядомую раскошу — раскошу чалавечых зносін, без якой...».***

***Мудра заўважана: чалавек можа абыходзіцца без многага, без чалавека — не. А таму — будзьма разам! І тады мы будзем.***

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

PARITETBANK

## «Открытое акционерное общество «Паритетбанк»

(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)

сообщает, что 17 января 2023 г.
в соответствии с решением Наблюдательного совета
ОАО «Паритетбанк» от 30 декабря 2022 г.

## состоится внеочередное Общее собрание акционеров

**ОАО «Паритетбанк» в заочной форме**
по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а

## Повестка дня:

О внесении изменений в Устав ОАО «Паритетбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 01 января 2023 г.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетень для заочного голосования и информацию (документы) к внеочередному Общему собранию акционеров лица, имеющие право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, могут по месту проведения собрания (нахождения ОАО «Паритетбанк») 9-10 января 2023 г. с 09.00 по 16.00.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров (нахождения ОАО «Паритетбанк») по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а – не позднее 12 января 2023 г.

Телефон для справок +37517 311 45 37.

**Наблюдательный совет ОАО «Паритетбанк»**

*ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809. Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 01 апреля 2021 года № 5.*

**Организация ООО «А-Сити»** уведомляет посетителей и арендаторов ТРЦ «Арена Сити», расположенного по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 84, что с **5 января 2023 года посещение паркинга будет осуществляться на платной основе**.

УНП102403084

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»

## «8» февраля 2023 в 14.00 проводит торги по продаже следующего имущества

| № п/п | Наименование объекта продажи | Описание | Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-8973 | Общая площадь – 496,2 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание паравозно-тракторного депо, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н., Гончанский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская | 29 640,00 (двадцать девять тысяч шестьсот сорок рублей 00 копейки), в т. ч. НДС 20 % – 4940,00 (четыре тысячи девятьсот сорок рублей 00 копеек | 2 964,00 (две тысячи девятьсот шестьдесят четыре рубля 00 копеек) |
| **Лот № 2** | Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-8957 | Общая площадь – 91,6 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газораспределительные станции), наименование – здание мастерской, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н., Гончанский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская | 8 400,00 (восемь тысяч четыреста рублей 00 копейки), в т. ч. НДС 20 % – 1400,00 (одна тысяча четыреста рублей 00 копеек | 840,00 (восемьсот сорок рублей 00 копеек) |
| **Лот № 3** | Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-8961 | Общая площадь – 259,3 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание материального склада, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н., Потокский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская, 2. | 14 400,00 (четырнадцать тысяч четыреста рублей 00 копейки), в т. ч. НДС 20 % – 2400,00 (две тысячи четыреста рублей 00 копеек | 1440,00 (одна тысяча четыреста сорок рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:** ОАО «Торфопредприятие Днепровское», 213332, д. Годылево, Быховский р-н., Могилевская обл., ул. Гасана, 12, УНП 700083371, тел. для осмотра объектов продажи +375336438989.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1, 2, 3 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся в 8 февраля 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 7 февраля 2023 до 12.00.

Регистрация участников торгов 8 февраля 2023 с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375296927492 (А1).

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 02-12/2022 эм

# Изменения

## в Проспект эмиссии жилищных облигаций первого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций первого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 22.02.2021 № 01-02/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 03-12/2022 эм

# Изменения

## в Проспект эмиссии жилищных облигаций второго выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций второго выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 22.02.2021 № 02-02/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 04-12/2022 эм

# Изменения

## в Проспект эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 22.02.2021 № 03-02/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 05-12/2022 эм

# Изменения

## в Проспект эмиссии жилищных облигаций четвертого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций четвертого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 14.05.2021 № 01-05/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 06-12/2022 эм

# Изменения

## в Проспект эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 14.05.2021 № 02-05/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

**УТВЕРЖДЕНО**
Решением единственного Участника
ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»
от 27.12.2022 № 07-12/2022 эм

# Изменения

## в Проспект эмиссии жилищных облигаций шестого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

Внести следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций шестого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»), утвержденный решением общего собрания участников ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ», протокол от 14.05.2021 № 03-05/2021 эм (далее – Проспект):

1. Пункт 1.11. Проспекта изложить в следующей редакции:

«1.11. Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) эмитента:

Общество с ограниченной ответственностью «Стар технолоджис», зарегистрированное 13.03.2019 Минским горисполкомом в ЕГР за № 192824122, расположенное по адресу: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, 4-й этаж, помещение 15. Доля в уставном фонде – 100 (сто) процентов».

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор
А. А. Сидоренко

Главный бухгалтер
Т. В. Коробкина

# ПЛАНУЙЦЕ, ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ, ПРАЦУЙЦЕ, СТВАРАЙЦЕ

## Якім для вас будзе год Труса?

**Сімвалам новага 2023 года стане Чорны Вадзяны Трус — мілы і прыязны персанаж. Галоўная каштоўнасць для пухнатага звярка — сям'я, таму ў новым годзе трэба зрабіць акцэнт на асабістых адносінах, праводзіць больш часу з роднымі і блізкімі. Тым, хто знаходзіцца ў пошуку спадарожніка жыцця, новы год падорыць сустрэчу са сваёй другой палавінкай, а тым, хто ўжо знаходзіцца ў адносінах, прынясе шчаслівае вяселле і прыбаўленне ў сям'і.**

**Паспрыяе Трус і ў вырашэнні кватэрнага пытання. Усім, хто яшчэ не абзавёўся ўласным жыллём, у новым 2023 годзе паступіць выгадная прапанова. Спрыяльным гэты час стане і для вандровак. Абавязкова варта наведаць сваякоў, якія жывуць у іншых гарадах. Трусік ацэніць ваша імкненне быць побач з блізкімі і падорыць поспех. Нечаканых кар'ерных скачкоў сімвал новага 2023 года не прынясе, але добразычліва паставіцца да намаганняў і працавітасці. Лічыцца, што, калі рэй вядзе Трус, асабліва шчасціць адвакатам, сакратарам, памочнікам кіраўнікоў і суддзям. Спалохаць поспех у 2023-м можна буйнымі сваркамі і спантаннымі рашэннямі. У новым годзе ўсе канфлікты лепш вырашаць мяккай сілай, дамаўляцца і ісці на кампрамісы.**

### ШАЛІ



2023 год для Шаляў пройдзе ў энергічнай атмасферы — падзеі будуць хутка змяняць адна адну. Атрымаюць поспех прадстаўнікі знака, якія змогуць падладзіцца пад такую дынаміку: з цікавасцю праяўляць ініцыятыву і хапацца за прадстаўленыя шанцы. Шалям трэба цвяроза ацэньваць сваю ўдачлівасць — не рызыкаваць дарма, у тым ліку не змяняць рэзка працу, нават калі новая прапанова здасца вельмі выгаднай. Такія перамены не прынясуць задавальнення — больш за тое, можа знікнуць любое жаданне расці і ўдасканальвацца.

### КАЗЯРОГ



У гэтым годзе Казярогам не да адпачынку і нуды: работа і сям'я ўвесь час будуць нагадваць пра сябе, патрабуючы ўвагі і падтрымкі. Большую частку года давядзецца выдаткаваць на вырашэнне чужых праблем, так што ўсім прадстаўнікам знака трэба забыцца пра свае патрэбы і цалкам засяродзіцца на выратаванні родных і сяброў ад разнастайных нягод. Сваё меркаванне трэба будзе адстойваць з асаблівай стараннасцю — стойце на сваім, інакш рызыкуеце страціць сябе.



### АВЕН



Наступны год складзецца для Авенаў даволі ўдала, таму ўжо пад бой курантаў можаце смела пачаць будаваць грандыёзныя планы. Практычна ўсё задуманае пры належнай стараннасці ажыццявіцца ў поўным аб'ёме. Не варта ўпускаць ні хвіліны гэтага прадукцыйнага года. Плануйце, дзейнічайце, працуйце, стварайце, пачынайце новае. Неразумна чакаць лепшага часу, чым цяпер. Заўтра будуць ужо новыя магчымасці, якія зноў нельга страціць.

### ЦЯЛЕЦ



Год Труса стане для Цяльцоў не самым спакойным, але стабільным і паспяховым. Ён абяцае вам шэраг поспехаў і станоўчых момантаў. Цяльцы будуць удачлівыя ва ўсіх сферах: у працы, бізнесе, адносінах, каханні, кар'еры... Таму ваша жыццё будзе напоўнена не толькі працоўнымі буднямі, але і весялосцю. Акрамя таго, астролагі рэкамендуюць праводзіць водпуск са сваякамі і сябрамі, тады вы надоўга зможаце запомніць выдатныя моманты.

### БЛІЗНЯТЫ



Новы год зарадзіць Блізнят невычэрпнай энергіяй. Прадстаўнікі гэтага знака адчуюць сябе здольнымі адолець горы і сапраўды зробяць гэтак. Час адпраўляцца на пошукі свайго шчасця: усё таму спрыяе. Вы не пабаіцеся кінуцца ў вір галавою ў новую працу, захапленне ці нават рамантычныя адносіны.

### РАК



Для Ракаў год складзецца ў цэлым удала, хоць і не абыдзецца без рэзкіх паваротаў. Памятайце, што ўсё залежыць ад вашага цярпення і ўмення своечасова рэагаваць на змены вакол. Значных станоўчых перамен чакаць не давядзецца, але ў цэлым спрыяльны кірунак жыццё ўсё ж такі прыме. Шчаслівы збег абставін будзе як нельга дарэчы. Калі сітуацыя абвострыцца да мяжы, толькі Ракі змогуць выйсці цэлымі з агню. Увогуле, фартуна будзе на вашым баку...

### ЛЕЎ



Год Чорнага Труса будзе для Львоў вельмі цікавым, напоўненым рознымі падзеямі і знаёмствамі. Сёлета вам удасца па-сапраўднаму паказаць сябе, праявіць сацыяльныя навыкі і ўменне працаваць на публіку. Дарэчы, гледачоў вакол заўсёды будзе дастаткова. У асабістым жыцці ўсё цудоўна. Бытавыя сваркі і дробныя рознагалоссі не змогуць разбурыць сапраўдныя пачуцці Львоў. Адносіны будуць складвацца шчасна, асабліва калі прадстаўнікі знака зробяць упор на іх якасць, напрыклад пачнуць прапрацоўваць даўно наспелыя праблемы.

### ДЗЕВА



Рамантыка, стабільнасць, гармонія — вось што абяцае год Вадзянога Труса. Калі ў прадстаўнікоў знака ёсць каханы, то ў 2023 годзе іх душэўная блізкасць стане мацнейшай. Свабодным Дзевам трэба падрыхтавацца да незапланаванай сустрэчы, якая выльецца ў прыемныя рамантычныя адносіны. Таксама не варта забывацца на родных і сяброў. Зносіны з імі будуць больш далікатнымі — найменшая халоднасць ці няўвага могуць прывесці да буйной сваркі. Каб пазбегнуць гэтага, важна паспрабаваць сумяшчаць асабістае жыццё і зносіны з сям'ёй. У новым годзе вам рэкамендуецца адкладваць грошы, заводзіць новых сяброў і заключаць бізнес-кантракты. Не варта чакаць імгненнага здзяйснення ўсіх жаданняў. Выдаткуйце час, каб залажыць трывалы падмурак для планаў.

### СТРАЛЕЦ



Надыходзячы год дасць Стральцам магчымасць пачаць усё нанова і выправіць мінулыя памылкі. Толькі вам вырашаць, у якой сферы прыкласці максімум намаганняў, бо практычна ўсе вашы пачынанні ў выніку акажуцца паспяховымі. У будучым годзе старайцеся менш сумнявацца ў сабе, бо ў вас ёсць усё, каб атрымаць жаданае. Трэба толькі крышачку папрацаваць — тады ні адна мэта не застанецца няскоранай. Не дазваляйце ляноце ўзяць над вамі верх, будзьце больш актыўныя, ініцыятыўныя. Страху невядомасці таксама трэба даць бой, інакш з месца вы не зрушыцеся.

### СКАРПІЁН



Увесь гэты год для Скарпіёнаў — сапраўдны падарунак. Ён прынясе з сабой палёгку і спакой пасля залішне эмацыянальнага года. Хоць у цэлым сумаваць не давядзецца, бо заступнік года ўжо падрыхтаваў для вас масу захапляльных падзей. Жыццё не будзе стаяць на месцы, а ваша задача — трымаць руку на пульсе.

### ВАДАЛІЎ



Год Вадзянога Труса акажацца для Вадаліваў сапраўдным падарункам лёсу. Нават тыя сферы, дзе раней прадстаўнікі гэтага знака не хапалі зорак з неба, хутка скорацца іх напору. Сімвал года садзейнічае таму, каб іх сіла і энергія заўсёды былі на вышыні. Галоўная задача — падтрымліваць добрыя адносіны з блізкімі. А таксама не баяцца завязваць новыя знаёмствы. Прадставіцца некалькі выдатных магчымасцяў пазнаёміцца з уладнымі людзьмі, якія ўпускаць сапраўды нельга!

### РЫБЫ



Рыбам будучы год рыхтуе стабільны і спакойны працяг жыцця. Кардынальных перамен чакаць не варта, але баяцца будучыні — таксама: у рэшце рэшт, усё складзецца так, як вам таго і хацелася. Проста трэба навучыцца глядзець на свет шырэй і быць адкрытымі новаму. Нягледзячы на клопаты, год будзе плённы, удасца шмат зрабіць і яшчэ больш запланаваць. Не бойцеся строіць доўгатэрміновыя планы, бо ўвага да дэталяў — гэта залог поспеху практычна ў любой справе. Не забывайце надаваць належную ўвагу каханаму чалавеку і дзецям.

Ведай сваё!

# САМЫ ЧАС У ГОСЦІ ДА ЗЮЗІ

**Праз восем гадоў перапынку брэнд Пастаўскага краю «Зюзя Паазёрскі» зноў вярнуўся на малую радзіму. Ён запрашае дзяцей і дарослых у навагоднюю казку.**



Зюзя — бог зімы ў беларусаў — увайшоў у масавую свядомасць жыхароў Віцебскай вобласці як аналаг рускаму Дзеду Марозу з-пад лёгкай рукі дырэктара турысцкага цэнтра паслуг Ягора Шушкевіча. Каларытны беларускі дзед з доўгай белай барадой і адметным касцюмам з элементамі арнамента з'явіўся на Пастаўшчыне ў 2005 годзе і стаў культурным брэндам не толькі раёна, але і ўсёй краіны.

Нашы продкі ўяўлялі бога зімы ў вобразе дзядулі з чырвоным носам, які ў самыя лютыя маразы хадзіў басанож у белым кажушку з жалезнай булавой. Перад Раством у кожнай хаце гатавалі куццю, каб задобрыць суровага дзеда, на асобны стол ставілі талерачку і для яго: каб моцна не ўладарыў, не марозіў азімыя і хатнюю жывёліну. Казалі: «Зюзя на дварэ — куцця на стале». Ад мянушкі героя міфалогіі з'явіліся вытворныя словы: «зюзець» — мёрзнуць, «назюзюкацца» — перабраць моцных напіткаў. Ва ўсведамленні беларусаў Зюзя не быў адзінокім, разам з дзедам заўсёды былі сябры і памочнікі.

У вобразе Зюзі гасцей у Паставах сустракаў сам Ягор Шушкевіч. Мужчына ўспамінае, што ідэя адрадзіць і трансфармаваць героя беларускай міфалогіі нарадзілася пасля таго, як з дыпломам інстытута культуры Ягор пэўны час папрацаваў дырэктарам мясцовага Дома культуры, а пасля вырашыў перакваліфікавацца ў сферу турыстычных паслуг. Такім чынам, Зюзя Паазёрскі стаў сімвалам культуры і турызму. Паглядзець на беларускае дзіва прыязджалі з усёй краіны, а таксама з Расіі, былі ў гасцях і прадстаўнікі Кітая, сонечнай Венесуэлы.

Арганізатары «прапісалі» беларускага Дзеда Мароза ў сядзібе на беразе возера Белае. Спачатку хацелі зацікавіць мясцовых дзяцей і іх бацькоў, аднак міфалагічны герой, які літаральна ажыў у Паставах, набіраў папулярнасць у небывалых маштабах. У госці да белабародага чараўніка пачалі прыязджаць наведвальнікі з усёй Беларусі, бо дабрацца да галоўнага Дзеда Мароза, што ў Белавежскай пушчы, — справа з нялёгкіх. Апошнія восем гадоў казачны персанаж «жыў» у Наваполацку, вандраваў па розных кутках Беларусі, дадаючы нацыянальнага каларыту кожнаму навагодняму мерапрыемству. Трэба падкрэсліць, што для Шушкевіча гэта не проста справа душы, але і запатэнтаваная гандлёвая марка.

Доўгі васьмігадовы адпачынак Зюзі, з якім звыкліся не толькі беларусы, але і госці з бліжняга замежжа, быў абумоўлены пошукам новага месца дыслакацыі чараўніка, аднак гэтай зімой культурны брэнд вярнуўся на Пастаўшчыну.


Фота газеты «Пастаўскі край».

Да вяртання персанажа дадому пачалі рыхтавацца ў 2021 годзе, мясцовыя ўлады падтрымалі праект, які знайшоў пазітыўны водгук на буйных турыстычных выставах у Беларусі і Расіі. Яшчэ адна адметнасць і без таго захапляльнага дзеда — не звыклы посах, а марозная булава, а яшчэ — пашыраная галерэя славянскіх духаў, у якой зараз 14 «жыхароў»: вадзянікі, русалкі, лесуны...

Прымаць ахвотных пазнаёміцца з персанажамі міфалогіі ў Азёрках (на базе спартыўна-турыстычнага комплексу) пачалі 16 снежня. У праграме «Бай і Зюзя карагодзяць у акрузе» — не толькі мноства гульняў, песень і танцаў, але і знаёмства з новымі героямі: Карачуном, Напасцю, Тэкляй, Бадзюлям. У дуэце чараўнікоў з Зюзям — дзед Бай — герой казак пісьменніка Уладзіміра Дубоўкі, карані якога таксама з Пастаўшчыны. Пасля захапляльнага тэатральнага шоу добры Зюзя частуе гасцей духмянай гарбатай і пернікамі, вянчае вечар у рэзідэнцыі яркі феерверк. Работа ў Азёрках не спыняецца: сустракаць гасцей плануюць да старога Новага года, таму кожны ахвотны можа паспець у прамым сэнсе дакрануцца да звышнатуральнага.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 17.02 | 7.34 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.44 | 7.20 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.51 | 7.33 |
| Гомель — | 9.06 | 16.56 | 7.50 |
| Гродна — | 9.41 | 17.18 | 7.37 |
| Брэст — | 9.34 | 17.27 | 7.53 |

### Месяц

*Першая квадра 30 снежня. Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр. Дзмітрыя, Настассі, Фёдара.*
*К. Ангелікі, Анелі, Рыгора, Яўгена.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**4 СТУДЗЕНЯ**

У краіне

**1729** год — нарадзіўся (Навагрудскі павет) Іахім Літавор Храптовіч, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філосаф, публіцыст, паэт і перакладчык. Прыхільнік фізіякратызму. Фізіякраты разглядалі грамадства як натуральны арганізм, што з'яўляецца часткай прыроды, у якую ўваходзяць чалавек і яго маральныя прынцыпы. Калі ж чалавек губляе заканамерную сувязь з прыродай, ён становіцца ізгоем, бескарысным для сябе і грамадства. У сваіх радавых маёнтках Шчорсы (Навагрудскі павет) і Вішнева (Ашмянскі павет) замяніў паншчыну чыншам. Пабудаваў у Шчорсах палац, школу, уніяцкую царкву, арганізаваў бібліятэку з архівам (150 адзінак сеймавых і сеймікавых актаў, каралеўскіх пісьмаў і іншага). У яго бібліятэцы было больш за 10 тысяч экзэмпляраў кніг, у тым ліку творы найвялікшых філосафаў, рымскіх і грэчаскіх класікаў, італьянская і французская класічная літаратура, творы па гісторыі Беларусі, Літвы і Польшчы. Бібліятэкай Храптовіча карысталіся вучоныя Іаахім Лялевель, Ян Снядзецкі. Бываў у ёй і Адам Міцкевіч. Сярод бібліятэкараў працаваў Ян Чачот. З 1791 года — міністр замежных спраў, з 1793-га — канцлер ВКЛ.



**1869** год — нарадзіўся Ядвігін Ш. (Лявіцкі Антон Іванавіч), беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў беларускай прозы. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка», «Васількі», паэмы «Дзед Завала». Яго пяру належыць першы беларускі раман «Золата», які пісьменнік, быўшы вельмі хворым, так і не скончыў.

**1923** год — нарадзіўся Мікола (Мікалай Міхайлавіч) Ваданосаў, беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. У 1966—1982 гадах працаваў у выдавецтвах «Беларусь» і «Мастацкая літаратура». Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцяў для дзяцей «Першае знаёмства», «Аднагодкі», «Рачны госць», «Клад Загорскай камяніцы» і іншых.

**1948** год — нарадзіўся (г. п. Глуск) Валерый Кірылавіч Іваноў, беларускі кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі. Сярод твораў: сімфоніі, кантаты, канцэрты, музыка да кіна- і тэлефільмаў і іншае. Асноўныя дасягненні кампазітара — у жанры песні. Сярод іх: «Пахне чабор», «Тапаліны звон», «Гуляць дык гуляць», «Каханая» і многія іншыя на вершы беларускіх паэтаў.

У свеце

**1643** год — нарадзіўся Ісаак Ньютан, англійскі фізік і матэматык. Стварыў тэарэтычныя асновы класічнай механікі і астраноміі. Адкрыў закон сусветнага прыцягнення.

**1785** год — нарадзіўся Якаб Грым, нямецкі філолаг, разам з братам Вільгельмам з'яўлецца аўтарам і збіральнікам казак нямецкага фальклору.

**1850** год — пасля інсцэніроўкі расстрэлу асуджаным петрашэўцам, уключаючы Ф. М. Дастаеўскага, абвешчана аб памілаванні.

**1923** год — у газеце «Правда» былі апублікаваны «Старонкі з дзённіка» У. І. Леніна, у якіх ён заклікаў узмацніць барацьбу з непісьменнасцю.

Так гаварыў...

**АВІДЗІЙ:**

*«Каханне травамі не лечыцца».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сустракаюцца два сябры ўвечары 1 студзеня:**

**— Прывітанне. Як Новы год сустрэў, пакуль бацькі ў ад'ездзе?**

**— Як-як? Ды як навагодні падарунак...**

**— У сэнсе?**

**— Усю ноч пад ёлкай праляжаў.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 51.
Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2023 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12